Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 310 (4216)
Панядзелак, 16 лістапада 1931 г.

## ЗЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫЯ—Поўнасьцю выканаць загатоўчыя пляны (1-я стар.). Мікуцкі—Якасьць валакна—важнейшае зьвяно ў барацьбе за лён (4 стар.). Е. КАРЛОЎСКІ—Нарастае рэвалюцыйная хваля рашаючых клясавых баёў у Польшчы (2-я стар.). А. Ф.—Новы парадак крэдытаваньня патрабуе выразнай работы гаспадарчых органаў (3-я стар.).
АГЛЯД ДРУКУ—«Лявацкія» загібы жывяць правую практыку (2-я стар.).
КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ СУШЫЛЬШЧЫКАЎ, МЯЛЬШЧЫКАЎ, ГРАПАЛЬШЧЫКАЎ—вопытных брыгадзіраў (1-я стар.).
Парткалектывы фабрыкі «Дзьвіна» і лесазаводу № 13 падаюць узоры баявой падрыхтоўкі да перавыбараў парторганаў (3-я стар.).
Кіраўніцтва Белмяса недаацэньвае плянаваньня, ігнаруе гаспадарчы разрахунак (2-я стар.).
ВЕРШ.—Янка Купала—Дзьве крыўда адвечная сьпела (3-я стар.).
Заява тав. Літвінава (1-я стар.).
КІТАЙ. Жорсткія баі ў Манчжурыі (4-я стар.).
ПОЛЬШЧА. Яўрэйскія пагромы па ўсёй Польшчы (1-я стар.)
ПА СССР І БССР (4-я стар.).

# ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ЗАГАТОЎЧЫЯ ПЛЯНЫ!

Загатоўкі ў гэтым годзе маюць вылючнае палітычнае значэньне. Поўнае выкананьне загатоўчага пляну за бясьпечыць тэмпы народна-гаспадарча га разьвіцьця, што намячаюцца партыяй, як 4-га кварталу 3-га рашаючага, так і чацьвертага—апошняга году пяцігодкі.

Абстаноўка загатоўчай кампаніі гэтага году іншая, чым у мінулым. Яна вызначаецца тымі новымі посьпехамі ў сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, якія мы атрымалі за мінулы год. 60 проц. сялянскіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы на СССР, 50 проц.—па БССР. Калгасьнік стаў ужо ня толькі моцнай апорай улады па вёсцы, але і цэнтральнай фігурай зямлеробства. Магутны рост саўгасаў і калгасаў, нашы посьпехі ў барацьбе з кулацтвам—вось асноўныя моманты, якія вызначаюць новую абстаноўку, а адсюль новыя задачы перад нашымі партарганізацыямі.

Сканцэнтраваць усе сілы на важнейшых вузлавых задачах, якія выцякаюць з новай абстаноўкай, працаваць па-новаму—асноўныя ўмовы пасьпяховага ходу важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній.

Нездавальняючы ход загатовак, за выключэньнем бульбы, плян адгрузкі якой пралетарскім цэнтрам СССР ужо выкананы (па збожжы па 10 лістапада—51,2 проц., па ільне на 5 лістапада—4,7 проц., па жывёле—32,5 проц. квартальнага пляну), тлумачыцца, галоўным чынам, неразуменьнем радам раёнаў новай абстаноўкі, новых форм клясавай барацьбы, новых задач, што адсюль выцякаюць, няўменьнем па-бальшавіцку арганізаваць загатоўкі.

З дня апублікаваньня настановы ЦК КП(б)Б (25 кастрычніка) прайшло ўжо 20 дзён. Між тым, зрух у загатоўках пакуль яшчэ невыстарчальны. Настанова ЦК з усёй бальшавіцкай рэзкасьцю выкрыла прычыны адставаньня ў загатоўках, намеціла практычныя, дзейсныя шляхі для фарсаваньня іх.

Гэтыя прычыны застаюцца ва ўсёй сваёй сіле і на сёньняшні дзень.

Ня гледзячы на тое, што сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі БССР у гэтым годзе здае 40 проц. ігульнай таварнай прадукцыі і што ўтым самым вымагаецца асабліва моцнае кіраўніцтва і дапамога партар ганізацый у пытаньнях здачы калгасамі і саўгасамі сваёй прадукцыі дзяржаве, мы на справе ў радзе арганізацый гэтага ня маем.

Арганізацыі значнай часткі раёнаў, а таксама і некаторыя цэнтральныя ўстановы (Белсельтрэст) ня гледзячы на сваячасовыя катэгарычныя дырэктывы ЦК КП(б)Б, ня здолелі арганізаваць масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў на пасьпяховае выкананьне імі загатоўчых плянаў, у гэтых раёнах не аказалі дзейснага бальшавіцкага кіраўніцтва калгасамі і саўгасамі.

Бязьдзейнасьцю гэтых арганізацый карыстаўся кулак, які праз распальваньне спажывецкіх тэндэнцый серод найбольш адсталых груп калгасьнікаў процідзеяў месьніцкія дзеянні запатрабаваньні інтарэсам пралетарскай дзяржавы.

Клясавы вораг прабуе зрывам загатоўчых плянаў зрываць і выкананьне цэнтральнай задачы калгаснага руху—гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Тактыка кулака, разьбітага ў адкрытым баі, пакіравана на тое, каб ён не адкрытым шляхам, а новымі замаскаванымі мацэўрамі разбурыць калгас з сярэдзіны.

І зусім ясна, што там, дзе раённыя і сельскія партыйныя арганізацыі не паставілі ў цэнтры сваёй увагі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, там мы маем дрэнны ход загатовак, які не забясьпечвае выкананьня пляну. І наадварот, дзе партыйныя арганізацыі арганізавалі пабальшавіцку загатоўкі, там мы маем лепшыя посьпехі ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Загатоўчая кампанія гэтага году цясьнейшым чынам зьвязана з пытаньнямі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Апартуністычна пастроеныя элементы не зразумелі таго, што ў калгасах на данай стадыі іх арцельнага разьвіцьця ёсьць элементы клясавай барацьбы. Апартуністычная ідэалізацыя калгасаў прыводзіць да натураньня кулацкім рвацкім тэндэнцыям, накіраваным на зрыў загатовак, да забываньня інтарэсаў пралетарскай дзяржавы, да адмаўленьня кіруючай ролі рабочае клясы ў яе саюзе з сялянствам.

Дагэтуль мы яшчэ маем праяўленьні правага апартуністу, якія выяўляюцца ў пажаданьні прымусіць кулацка-сяўскія гаспадаркі выканаць цьвёрдыя заданьні.

З гэтай адкрытай правааапартуністычнай практыкай кожная партарганізацыя павінна весьці самае бязьлітаснае змаганьне. Адначасова трэба рашуча змагацца і супроць атрымаўшай пашырэньне ў асобных мясцох «левацкай» практыкі індывідуальнага абкладаньня сераднякоў—адназасобні-

Руйнуючы адпор кулаку і ўсім тым, хто яму дапамагае справа і «зьлева»!

Вялікае значэньне ва ўсёй загатоўчай рабоце мае адназасобны сэктар. Усякае забываньне адназасобнага сэктару, усякае ігнараваньне масавай растлумачальнай работы сярод бяднякоў-серадняцкіх мас вёскі вакол загатовак—ёсьць простая і непасрэдная дапамога кулаку. Гэта павінны памятаць усе нашы арганізацыі. Мы мелі ў нас у БССР у наасобных мясцох абураючыя выпадкі замены масавай работы загадам, камандаваньнем. Зусім ясна, што такая «ўстаноўка» ў рабоце дае толькі адмоўныя вынікі, што яна карэнным чынам супярэчыць усёй палітыцы партыі на вёсцы. Цярпліва і настойліва растлумачваць, арганізоўваць масы адназасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на поўнае выкананьне загатоўчых плянаў—вось адна з важнейшых задач, што стаяць перад нашымі партыйнымі арганізацыямі.

У бліжэйшы-ж дні павінен быць створан карэнны пералом у ходзе загатовак. Усе саўгасы, калгасы, МТС павінны стаць сапраўднымі арганізатарамі загатовак. Датэрміновай здачай прадукцыі дзяржаве, раўняючыся па перадавых, якія ўжо служаць прыкладам адназасобнікам, калгасы і саўгасы цалкам выканаюць сваю ролю арганізатараў-перадавікоў загатовак. Саўгасная і калгасная сыстэмы, партыйныя арганізацыі павінны забясьпечыць пястомную, энэргічную, настойлівую барацьбу з праяўленьнямі кулацкіх спажывецкіх буржуазных тэндэнцый у саўгасах і калгасах.

Кулацкіх абаронцаў бязьлітасна гнаць з дзяржаўнага, калгаснага апарату, з радоў партыі!

Па асобных відах загатовак у Беларусі перад арганізацыямі стаяць наступныя задачы. Спыніць усякія гутаркі аб тым, што «збожжа не зьяўляецца важным для БССР». Трэба цьвёрда ўсьвядоміць, што збожжазагатоўкі ў нас адыгрываюць вялізарную ролю, што таварнай прадукцыяй па збожжы мы забясьпечваем галоўную патрэбу ў хлебе БССР. Весьці бязьлітасную барацьбу супроць памяншэньня валавога збору, супроць стварэньня дутых, яўна перапавялічаных кармавых і харчовых балянсаў, за поўнае выяўленьне лішкаў збожжавых культур, ужыць усе меры па вывазцы і забесьпячэньні хаваньня збожжа. Збожжазагатоўкі ўступілі ў рашаючую фазу. На працягу лістапада мы павінны атрымаць рашаючую перамогу ў збожжазагатоўках.

Мы ўжо атрымалі перамогу ў алтрэцы бульбы пралетарскім цэнтрам СССР.

Зараз задача заключаецца ў тым, каб пераключыцца па-баявому на выкананьне плянаў загатовак для патрэб насельніцтва і прамысловасьці БССР.

Асабліва значэньне маюць загатоўкі ільна-канапель. Важнейшай умовай пасьпяховых загатовак ільну зьяўляецца арганізацыя першапачатковай апрацоўкі яго як у калгасах, так і ў адназасобным сэктары. Ільназагатоўкі толькі пачаліся. Неабходна падрыхтаваць прыёмачныя пункты, праверыць пляны выканаўня завозу прамтавараў, дабіцца таго, каб загатоўчы апарат прымаў непасрэдны ўдзел ня толькі ў загатоўцы, але і ў апрацоўцы ільну. Мабілізаваць усе сілы партарганізацый на арганізацыю ільназагатоўчай кампаніі.

Вялікае значэньне мае для БССР выкананьне плянаў загатовак па мясе. Ужо цяпер выявіліся яўна нездаровыя тэндэнцыі ў выкананьні мясазагатовак. Яны выказваюцца ў тым, што ў радзе месц праводзяць мясазагатоўкі выключна за лік буйной рагатай жывёлы, у той час, як загатоўка сьвіней праводзіцца зусім слаба. Павысіць агульныя тэмпы загатовак, змагацца з нездаровымі тэндэнцыямі ў іх, накіраваць увагу арганізацый на поўнае выкананьне пляну мясазагатовак—вось важнейшыя задачы арганізацый у правядзеньні мясазагатоўчай кампаніі.

Пастанова кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні савецкага гандлю і паляпшэньні рабочага забесьпячэньня павінна быць праломлена ў нашых загатоўчых арганізацыях узмоцненай работай па самазагатоўках. ЦРК, ЗРК, ЗВК і ТПО. Пастанова пленуму павінна быць рэалізавана праз разгорнутую работу каапэрацыйных арганізацый, саўгасаў і калгасаў «пры абавязковай умове першачарговай здачы (продажу) прадукцыі дзяржаве па цэнтралізаваных плянах». (Пленум ЦК УсеКП(б).

Перавыбары парторганаў, якія зараз адбываюцца, шырока скарыстаць для ўзмацненьня тэмпаў загатовак, для поўнага выкананьня пляну.

Па-бальшавіцку перабудаваць на выкананьне важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы!

# НА ЗЯБЛІВА ПЕРАКІНУТА

## ЯШЧЭ НЯЗНАЧНАЯ ЧАСТКА КОНЯЙ

## Пад'ём цаліны не адкладваць на апошнюю чаргу

### 3.645 гэкт. цаліны чакаюць аратых

КАПЫЛЬ. Ня гледзячы на пастановы ўраду аб пераключэньні 100 проц. трактараў і 50 проц. коняй на зяблі ва, капыльскімі зямельнымі арганізацыямі і ў прыватнасьці МТС гэта пастанова ня выконваецца. На 15 лістапада з 24 трактараў на зяблі ва не ракінуты толькі 20.

Конская цягавая сіла калгасаў таксама не пераключана. З усіх працаздольных коняй на зяблі ве працуюць толькі 10 проц.

Скончыўшы ворыва, раённыя кіруючыя арганізацыі не мабілізавалі калгасную масу і адназасобнікаў на выкананьне плянаў уздыму цаліны. Замест 4.000 га ўзьнята толькі 365 га. РК КП(б)Б і РВК павінны прыняць усе захады да 100 проц. выкананьня пляну цаліны.

Б.

Ліквідаваць абязьлічку ў догледзе за канём. На эдымку: Цяжкастанные коняй у калгасе

### У Смалявічах мала клапоцяцца аб выкананьні дырэктыў ураду і партыі

СМАЛЯВІЧЫ. Смалявіцкі райкалгасаюз і МТС яўна недаацэньваюць гаспадарча-палітычнага значэньня зяблевай кампаніі. Па калгасным сэктары плян выканан толькі на 50 проц. Конскай цягавай сілы калгасаў пераключана на ворыва 20 проц., а з 42 трактараў—толькі 12.

РК КП(б)Б павінен рашуча ўдарыць па тых, хто ігнаруе пастанову ўраду аб 100-процантным пераключэньні трактараў на зяблі ва, і прыняць захады для выкананьня плянаў ворыва, каб да наступленьня марозаў апошні быў выкананы поўнасьцю.

Л. Я.

### Па сьладох крытыкі „Зьвязды"

ВУЗДА. 10-га лістапада ў заметцы «Чакаюць паўтарзьняя замаразкаў» «Зьвязда» пісала, што Вузьдзенскі раён плян зяблі ва выканаў на 30 проц. Крытыка мела свой уплыў. На 15-га лістапада гэты плян выканан на 74,8 проц. Амаль усе работнікі райкалгасаюзу выехалі ў вёскі і калгасы раёну для правядзеньня масавай работы. 60 проц. коняй калгасаў перакінуты на ворыва.

### Трактары пераключаны, коні яшчэ гуляюць

КОЙДАНАВА. Пасьля зьмяшчэньня заметкі ў «Зьвязьдзе» пад назвай «Так не змагаюцца за зяблі ва», у працы Койданаўскай МТС ёсьць некаторы зрух. Паводле слоў дырэктара МТС усе трактары перакінуты на зяблевае ворыва. Аднак, МТС нічога не зрабіла, каб скарыстаць конскую сілу калгасу. На зяблевае ворыва пераключана толькі 15 проц. коняй.



Даб'ёмся эканоміі гаручага. На эдымку: Вучотчык вымерае фактычны расход гаручага пасьля работы трактару.

### Пераключыць на ворыва конскую сілу

ВОРША. (Белта). Зяблевае ворыва ў раёне застаецца і зараз адсталым вучасткам. На 10 лістапада плян выканан усяго на 71 проц. 4-ры трактары, якія працавалі на зяблі ве ў калгасах Веравойшчанскага сельсавету, выйшлі са строю з-за адсутнасьці змазачнага. Конская сіла калгасамі на ворыва не пераключана. Калгас «Новае жыцьцё», Шашкоўскага сельсавету, замест 60 га зааграў толькі 10. Калгас імя ЦВК БССР, Машкоўскага сельсавету, зяблі ць яшчэ не пачынаў.

### Зяблі ва адкладваюць на вясну

БАРЫСАЎ (БелТА). Праўленьне калгасу імя Фрунзэ яўна недаацэньвае палітычнай важнасьці зяблі ва. У выніку гэтага ў калгасе панае шкодны настрой, што араць можна і вясной, а цяпер няма часу. Кіруючыя такой думкай, гэты калгас зазяблі ў толькі... адзін гэктар. Апартуністычнай практыцы праўленьня райкалгасаюз павінен нанесьці руйнуючы ўдар.

# Заява тав. Літвінава

14-га лістапада народны камісар па замежных справах СССР тав. Літвінаў запрасіў японскага пасла пана Хірота і заявіў яму наступнае для перадачы японскаму ўраду.

У заяве, перададзенай вам намесьнікам народнага камісара па замежных справах Караханам 29-га кастрычніка г. г., саюзны ўрад ужо адзначыў поўную бяссэнсоўнасьць і хлусьлівасьць вымыслаў і чуткаў, якія выходзяць ад безадказных колаў, чамусьці зацікаўленых пры сучасным становішчы Манчжурыі ў папырэньні правакацыйных чуткаў. Урад СССР цалкам выразна заявіў, што ён трымаецца палітыкі суровага неўмяшаньня, якая выцякае з яго традыцыйнай нязьменнай палітыкі міру, ушанаваньня міжнародных дагавораў, заключаных з Кітаем і ўшанаваньня суверэнных правоў і незалежнасьці другіх дзяржаў. Саюзны ўрад меў права чакаць, што яго такая выразная і не пакідаючая месца для якіх небудзь сумненьняў ці недагаворак заява, якая паводле паведамленьня, зробленага вамі намесьніку Наркома замежных спраў Карахану, была спаткана са задаваленьнем японскім урадам, пакладзе канец правакацыйнай антысавецкай кампаніі і вымыслам аб дапамозе, што нібы та аказваецца ўрадам СССР якім-бы там ні было кітайскім войскам у Манчжурыі.

Саюзны ўрад з надзвычайным жалем вымушан канстатаваць, што зацікаўленыя японскія ваенныя колы працягваюць займацца вымыслам і распаўсюджваньнем праз японскі друк і тэлеграфныя агенцтвы, пазбаўленых усякай падставы, чуткаў аб аказаньні СССР дапамогі тым ці іншым кітайскім генэралам. Аб афіцыяльным характары і крыніцы гэтых чуткаў сьведчыць, між іншым, афіцыяльная заява, зробленая 12-га лістапада прадстаўніком японскіх улад у Мукдэне, дзе знаходзіцца простае сьцьвярджэньне аб перакідцы з Благавешчанска падмацаваньняў у выглядзе «кітайскіх і карэйскіх камуністаў». Саюзны ўрад ня можа пакінуць без увагі і той факт, што падобнае-ж меркаваньне было выказана таго-ж 12 лістапада японскім віцэ-консулам у Харбіне панам Накана ў яго гутарцы з кіраўніком генэральнага консульства СССР у Харбіне. Саюзны ўрад зварачае ўвагу японскага ўраду на гэту надобрасумленную антысавецкую кампанію, якая сыстэматычна праводзіцца некаторымі ваеннымі коламі ў Манчжурыі з мэтай ускладненьня адносін паміж Японіяй і СССР.

Разам з тым урад СССР лічыць сваячасовым напомніць, што ў запэўненьнях японскага пасла, зробленых мне, было сказана, што інтарэсам СССР ня будзе нанесена страт падзеямі ў Манчжурыі. Аб гэтым я павінен тым больш напомніць, што ёсьць інфармацыя аб падрыхтоўцы японскім камандваньнем перасячэньня К-Усх чыг. у раёне Цыцыкара з параліжаваньнем дзейнасьці чыгункі, што нанясе СССР матар'яльную страту. Саюзны ўрад лічыць, што запэўненьні зробленыя японскім ўрадам, захоўваюць сваю сілу і ня будуць парушаны.

# Яўрэйскія пагромы па ўсёй Польшчы

## ЦК КСМ Польшчы выдаў адозву

ВАРШАВА, 14. Яўрэйскія пагромы ня толькі ня спыняюцца, але наадварот, пашыраюцца і прымаюць з кожным днём усё больш і больш пагражаючыя разьмеры. Пагромы перакінуліся ў рад новых гарадоў: ва Львоў Прушкова, Пазнань, Сасновец, Ломжу і інш.

Паўтарыліся з новай сілай пагромы ў Кракаве, дзе самы актыўны ўдзел у іх прыняла моладзь поўвайсковых фашысцкіх арганізацый. Гэта зьяўляецца ня дрэнная ілюстрацыяй «барацьбы» ўраду з пагромшчыкамі.

Антысэміцкія выбрыкі ня спыняюцца і ў самой Варшаве. Групы фашысцкіх студэнтаў і вулічных хуліганаў ня спыняюць нападаў на яўрэяў, спакойна ідучых па вуліцы. Быў рад выпадкаў зьбіваньня жанчын, дзяцей і разгрому яўрэйскіх кватэр і крам.

Цікавую пазыцыю занялі ў апошні час польскія сацыял-фашысты, якія да гэтага часу «аб'ектыўна» наглядалі за разьвіцьцём падзей. Цяпер, замест таго, каб рашуча стаць у абарону яўрэйскіх мас, «сацыялісты» ў сваім цэнтральным органе «Роботнік» (ад 13 лістапада) паняшаюць сябе тым, што «хваля антысэмітызму ўзрасла ва ўсёй цэнтральнай Эўропе».

Сацыял-фашысты з пафасам «адкрываюць» прычыну пагромаў, бачачы яе ў тым, што... яўрэі супрацоўнічаюць з урадам. Выходзіць, што польскае фашысцкае студэнцтва зьбівае яўрэйскіх студэнтаў за тое, што яны фашысты. Вось да чаго дайшлі ў сваёй мудраваньнях сацыял-прахвосты. Па даным прыкладзе мы ясна бачым, што ў палітыцы пагромаў не апошнюю ролю адыгрываюць і паны «сацыялісты». ППС усімі сіламі стараецца затушаваць, зацямніць сапраўдную прычыну яўрэйскіх пагромаў перад шырокімі працоўнымі масамі.

У сувязі з пагромамі ЦК КСМ Польшчы выдаў адозву, у якой заклікае ўсіх працоўных стаць у абарону яўрэйскіх мас, даць рашучы адпор пагромшчыкам.

Амаль ва ўсіх гарадох, асабліва ў рабочых цэнтрах, стварацца масавыя дружыны самаабароны. Пагромшчыкі штораз часьцей бываюць прымушаны ўцякаць.

Палітыка польскага фашызму, палітыка сёньня нацыянальнай варожасьці нямінуча разаб'ецца аб маналітны фронт інтэрнацыянальнай салідарнасьці працоўных усіх народаў Польшчы.

# Кожнай брыгадзе сушыльшчыкаў, мяльшчыкаў, трапальшчыкаў—вопытных брыгадзіраў

Рашуча змагаючыся з асяданьнем таварнай прадукцыі ільну ў вёсцы, поўнасьцю выканаць плян загатовак

## Ліквідаваць разрыў паміж мяцьцём і трапаньнем Ільну

ШКЛОЎ. (Наш. кар.). Шклоўскі ра-твам. У выніку гэтага, на 10-га лістапада зьмята ільну з плошчы 2.309 гэкт., а абтрапан толькі ўреджай з плошчы 1.155 гэкт. Трапаньне адстае, а разам з гэтым зацягваецца і выкананьне пляну загатовак.

Ёсьць яшчэ калгасы, дзе не арганізаваны брыгады сушыльшчыкаў, мяльшчыкаў і трапальшчыкаў. У большасьці калгасаў не прапрацавана пастанова НКЗ і Белкалгасцэнтру аб зьдзельна - прэміяльнай сыстэме па апрацоўцы ільну.

Райкаапсаюз і Райспажывсаюз, як асноўныя загатоўшчыкі ільну, не перабудавалі сваёй работы па-новаму. Зарплата загатоўшчыкаў не пераведзена ў залежнасьць ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі.

У выніку ўсяго гэтага загатоўкі ідуць надзвычай марудными тэмпамі. Ільнавалакна загатоўлена па 5-га лістапада 4,6 проц. па калгасным сэктары, і на адназасобным сэктары—3,1 проц. гадавога пляну. Ільнасемя калгасамі здана 60 проц. пляну, а адназасобнікамі—42 проц.

Зусім ганебна арганізаваны загатоўкі ільнасаломы і трасты, згодна дагавору паміж ільназаводам імя Сталіна, МТС і Райкаапсаюзам. Замест таго, каб на 1-га лістапада выкапаць поўнасьцю плян загатоўкі трасты, па 10-га лістапада МТС выкапала свой плян на 2,9 проц., а райкаапсаюз на 7,9 проц. Траста на ільназавод паступае нізкай якасьці, з вялікай вільготнасьцю. Прапускная здольнасьць заводу — 20 тон у суткі, а паступае толькі 5 тон.

Партарганізацыя раёну павінна выкарыстаць вопыт перадавых калгасаў, перанесьці яго ў адсталыя, і ў час месячніка забясьпечыць сапраўды ўдарныя тэмпы работы па пераапрацоўцы ільну і выкананьні пляну загатовак.

Усякім кулацка - спажывецкім настроям і спробам затрымаць лён нанесьці руйнуючы ўдар.

Ян. НОВІКАЎ.

### Чырвоныя абозы з ільнам

ГОРКІ. У дні сьвяткаваньня 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі калгасьнікамі і адназасобнікамі Горацкага раёну чырвонымі абозамі здана дзяржаве 18 тон ільнавалакна, 8 тон ільнасемя і 3 тоны канапель.

Брушкоў.

***

ДУБРОЎНА. Закончыўшы ўборку буль бы, праўленьне калгасу «Чырвоны пуцілавец» пераключыла рабочую сілу на пераапрацоўку ільну. Створаны спэцыяльныя брыгады. Паміж брыгадамі разгорнута сацыяпаборніцтва і ўдарніцтва.

У дзень 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі чырвоным абозам здана дзяржаве 800 клтр. валакна. Лепшыя ўдарнікі па пераапрацоўцы ільну прэміраваны ў часе сьвяткаваньня Кастрычніцкай гадавіны. Пераапрацоўка ільну працягваецца ўдарнымі тэмпамі.

Слуцкін.

### За месячнік скончыць загатоўкі абавязваецца Мсьціслаўшчына

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Мсьціслаўскі раён уключыўся ў месячнік па пераапрацоўцы і загатоўцы ільнавалакна, які абвешчан ЦК КП(б)Б.

Мсьціслаўская партарганізацыя бярэ на сябе абавязак у часе месячніка закончыць пераапрацоўку ільнавалакна і выканаць пляны загатовак.

Магікаў.

# Чарговы зьезд аўстрыйскіх сацыял-лёкаяў

ВЕНА, 15. У Грацы (сталіца правінцыі Штырый) учора адкрыўся чарговы зьезд аўстрыйскай сацыял-дэмакратычнай партыі. Прамова Фрыдрыха Адлера, вітаўшага зьезд ад імя II Інтэрнацыяналу, была прасякнута неспакоем у сувязі з ростам апазыцыйных плыняй унутры сацыял-дэмакратычнай партыі на фоне абвостранага эканамічнага крызісу. Канстатаваўшы значные разыходжаньне поглядаў унутры аўстрыйскай сацыял-дэмакратыі, Адлер заклікаў «не стварыць расколу і захаваць адзінства».

Дакладчык ЦК Юліус Дайч у справаздачным дакладзе высунуў на першы плян праблему рабочай моладзі, падкрэсьліўшы ўзрастаючае бродженьне ў яе радох. Сакратар сацыял-дэмакратычнага саюзу моладзі адзначыў супярэчнасьці, шчо існуюць паміж старым і новым пакаленьнямі ўнутры партыі, супакойваючыся, аднак, спасылкай на «агульную невядомасьць» гэтага. У прамовах дэлегатаў, якія выступалі, яўна праглядае боязнь аўстрыйскай сацыял-дэмакратычнай партыі страціць уплыў на 560.000 маладых выбаршчыкаў Аўстрыі.

З дакладам аб палітычным і гаспадарчым становішчы выступіў Отто Бауэр. Пад напорам вялізарнага абурэньня рабочых палітыкай сацыял-дэмакратычнай партыі ён усімі сіламі прабаваў апраўдаць парляманцкую тактыку сацыял-дэмакратаў, якая зводзілася да капітуляцыі перад буржуазіяй у пытаньнях аб аздараўленьні збанкрутаўшага буйнейшага аўстрыйскага банку «Крэдытанштальт», правядзеньні капіталістычнага «рэжыму эканоміі» ў бюджэце за кошт працоўных і г. д.

Бауэр быў вымушан у сваім дакладзе канстатаваць, што «росная і жорсткасьць» ня толькі беспрацоўных, але паваг працуючых мас усё больш павялічваюцца. Ва многіх, — заявіў Бауэр, — зьяўляецца мысьль расьсеч гордыеў вузел. У падобнай абстаноўцы Бауэр ужо ня мог, як на Венскім кангрэсе II інтэрнацыяналу ў кацы лістапада 1931 г., «прыняцьцёва» агнаньбіць «шлях гвалту бальшавіцкай дыктатуры». Цяпер Бауэр, пад націскам вялізарнага рэвалюцыйнага неадваленьня палітыкай сацыял-дэмакратычнай партыі, абмежаваўся тым, што прабаваў толькі даказаць «няпрыемлемасьць мэтадаў бальшавізму» ў канкрэтных аўстрыйскіх умовах. Магчыма, што рана ці позна можа быць увосень, — сказаў Бауэр, — наступіць становішча, калі буржуазія будзе ўжо ня ў стане, а пралетарыят яшчэ ня ў стане адзін кіраваць». У сувязі з гэтымі магчымасьцямі Бауэр прысьвяціў значную частку свайго дакладу доказу таго, што быццам «пры пэўных умовах» для сацыял-дэмакратыі ствараецца «неабходнасьць пайсьці ў буржуазны ўрад». Пры гэтым Бауэр агаварыўся, што ён даны момант яшчэ не лічыць «надыходзячым» для ўдзелу сацыял-дэмакратаў у каліцыйным урадзе.

(ТАСС).

Рабочы гарадок на Ніжагародзкім гіганце.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

# Парткалектывы фабрыкі „Дзьвіна“ і лесазаводу № 13

## ПАДАЮЦЬ УЗОРЫ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ ПАРТОРГАНАЎ

## Нізавому партыйнаму зьвяну— апэрацыйнае кіраўніцтва

Вытворчыя партарганізацыі прыступілі да правядзеньня справаздачна перавыбарчай кампаніі. На радзе прадпрыемстваў ужо разгорнута шырокая самаправерачная работа. Матар'ялы брыгады «Зьвязды», якія мы зьмяшчаем ніжэй, паказваюць, што рад вытворчых парткалектываў Віцебскай арганізацыі сапраўды па-баявому разгарнулі падрыхтоўку да перавыбараў парторганаў.

Парткалектыў фабрыкі «Дзьвіна» мабілізаваў масы членаў партыі і беспартыйных рабочых вакол задач перавыбараў, стварыў 12 самаправерачных брыгад, якія ўжо прыступілі да работы. На дрэнна разгортваецца кампанія і на лесазаводзе № 13. Прыклады гэтай работы Віцебская арганізацыя павінна перанесьці на ўсе парткалектывы і ў першую чаргу ў партарганізацыі такіх буйных прадпрыемстваў, як «Чырвоны мэталіст», панчошная фабрыка і інш.

Буйнейшыя вытворчыя парткалектывы Гомелю і Бабруйску таксама пабаявому разьвіваюць кампанію перавыбараў.

Цэнтральны Камітэт партыі з усёй сілай і выразнасьцю падкрэсьліў, што «перавыбарчая кампанія павінна прайсьці пад знакам карэннай перабудовы ўсёй партыйна-масавай работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі. Партарганізацыі павінны замацаваць першыя посьпехі перабудовы партработы на вытворчасьці і ўзьняць гэтую перабудову на новую вышэйшую ступень». Гэту дырэктыву вытворчыя партарганізацыі павінны ажыцьявіць цалкам і поўнасьцю ў сваёй практычнай рабоце.

Рад партыйных калектываў дабіліся ўжо станоўчых посьпехаў у перабудове партыйнай работы. Нізавыя партыйныя зьвяньні, (зьменныя ячэйкі, партгрупы) на справе давялі сваё ўменьне і здольнасьць арганізаваць масы на выкананьне вытворчых задач. Яшчэ больш павысіць арганізатарскую і кіруючую ролю нізавога партыйнага зьвяна, забясьпечыць яго штодзённым канкрэтным і апэрацыйным кіраўніцтвам — такая задача кожнага партыйнага калектыву.

Гэту задачу неабходна рэалізаваць у даную справаздачна - перавыбарчую кампанію з тым, каб яшчэ больш удасканальваць перабудову партыйнай работы, яшчэ больш узмоцнена арганізоўваць змаганьне мас за поўнае выкананьне і перавыкананьне вытворчых праграм.

## Партгрупы—у авангардзе барацьбы за прамфінплян

Менскі гарком КП(б)Б з 10 лістапада разгарнуў масавую самаправерачную кампанію работы партгруп на вытворчасьці.

У сувязі з гэтым, на сходзе парткалектыву заводу «Бальшавік» абмеркавана пытаньне работы партыйных груп. Устаноўлена, што дзякуючы праведзенай перабудове партыйнай работы на прадпрыемстве, перанясеньню цэнтру цяжару яе ў нізавыя вытворчыя зьвеньні — за апошні час значна павысілася кіруючая роля камуністаў у нізавых вытворчых зьвеньнях.

Падаме некалькі фактаў, якія харак тарызуюць ролю партыйных груп на забясьпячэньні выкананьня вытворчых задач. Партгрупа рамшчыкаў другога хромавага цэху забясьпечыла сваёй брыгадзе перавыкананьне прамфінплану. Гэта брыгада выканала прамфінплян за жнівень на 114 проц., за верасень па 122,9 проц. і ў кастрычніку па 126,6 проц., дабіўшыся эканоміі плошчы скуры толькі за верасень па 1875 руб. Брыгада наказчыкаў гэтага цэху за верасень дабілася эканоміі матар'ялу на 129 руб.

Бліскучыя ўзоры работы паказала партгрупа строгаляў першага хромавага цэху. Гэта партгрупа, правільна ажыцьцяўляючы парткіраўніцтва брыгадай, забясьпечыла перавыкананьне якасных паказальнікаў па ўсіх кантрольных заданьнях, пры выкананьні вытворчых заданьняў па 141 проц.

Аднак, паказаныя посьпехі не зьяўляюцца здабыткам усіх партгруп на заводзе. Мала аддаецца ўвагі рабоце з тымі брыгадамі, якія непасрэдна працуюць у цэхах, (лябараторыя, транспарт, дваровыя і г. д.). Сярод дваровых рабочых павялічыліся прагулы. Амаль ніхто з работнікаў канторы і лябараторыі ня ўцягнут у партыю чобу. Асноўным недахопам у рабоце партгруп зьяўляецца адсутнасьць плянаў і слабая пастаноўка вучоты работы.

Вельмі слаба перабудоўваецца ячэйка ЗРК і сталоўкі. Там яшчэ да гэтага часу нават не арганізаваны партгрупы.

Падагуліўшы вынікі работы партгруп, сход прапанаваў бюро парткалектыву забясьпечыць узмацненьне кіраўніцтва работай партгруп, як з боку самога бюро парткалектыву, так і бюро цэхавых ячэек.

Тав. ВІДАСЕЎ — кандыдат партыі, адзін з перадавых ударнікаў кушнернай фабрыкі.

# На поўным ходзе

Праведзен рэйд брыгад «Зьвязды» і «Віцебскага пралетара» па пытаньнях падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

На заводзе «Чырвоны мэталіст» пасат яшчэ ня ўсе ячэйкі абмеркавалі дырэктыўны ліст ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў (ячэйка такарнага цэху, ліцейнага, дрэваапрацоўчага і малярнага). У самаправерачныя брыгады ўцягнута зусім нязначная колькасьць партыйцаў. Плян праведзеньня перавыбараў абмяркован на сходзе парткалектыву толькі 11 ліста пада. З недахопаў у рабоце парткалектыву найбольш выдзяляецца становішча партвучобы. Да гэтага часу не ахоплена яшчэ больш 100 кандыдатаў і членаў партыі сеткай партшкол. Да тых асоб, якія ўхіляюцца ад партвучобы, ячэйкі пі ўжываюць ніякіх мер. У дні заняткаў партшкол праводзяцца розныя сходы і насяджэньні, што вядзе да зрыву заняткаў.

Партыйная і працоўная дысцыпліна на гэтым прадпрыемстве ня узнята на належную вышыню. Есьць паасобныя выпадкі самавольнага ўходу з работы і адмаўленьне ад работы з боку асобных камуністаў. Горш за ўсё, што па такія недапушчальныя зьявішчы парт'ячэйкі належным чынам не рэагуюць. Паводзіны гэтых гора-камуністаў адпаведным чынам не кваліфікуюцца.

Парт'ячэйка іголкавай фабрыкі не аддае ніякай увагі ўцягненьню ў справаздачна-перавыбарчую кампанію беспартыйных мас. У часе абмеркаваньня дырэктыўнага ліста ЦК КП(б)Б на сходзе парт'ячэйкі ня прысутнічала ні адкаго беспартыйнага рабочага. У спрэчках па гэтым пытаньні выказаліся толькі сакратар парт'ячэйкі і прадстаўнік таркому.

Літаральна нічога ня зроблена і парт'ячэйкай ФЗН швэйчыкаў у галіне разгортваньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Гэта пытаньне яшчэ нават не абмеркавана на сходзе ячэйкі.

Інакш стаіць справа на панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін. Па пытаньні перавыбараў па ўсіх зьменах адбыліся сходы парт'ячэек з удзелам камсамольцаў і беспартыйных рабочых. У часе абедзеннага перапынку ў цэхах і зьменах праводзяцца гутаркі аб задачах справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў. У кожнай зьменнай ячэйцы створаны самаправерачныя брыгады па асобных галінах работы ячэйкі.

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў парт'ячэйкі на лесазаводзе № 13 праходзіць пад знакам мабілізацыі рабочых па выкананьне вытворчых задач. У самаправерачныя брыгады ўцягнута 150 чалавек. Есьць значныя дасягненьні ў справе разгортваньня сацыябаборніцтва і ўдарніцтва. Калі раней на заводзе налічвалася 327 ударнікаў, дык зараз, у сувязі з праведзенай праверкай выкананьня самаабавязацельстваў, гэта лічба павялічылася да 364. З 41 ударнай брыгады 38 праведзена на гаспадарчы разрахунак. Ва ўсіх брыгадах уведзена прэміяльна-прагрэсіўная зьдзельшчына, што зьявілася вялікім стымулам узмацненьня прадукцыйнасьці працы. Калі раней выкатвалася ў дзень 325 шт. бярвеньняў, дык зараз гэта лічба даведзена да 590. Па адвозцы абрэзкаў прадукцыйнасьць працы ўзьнялася па 39,9 проц.; нагрузка на вагаэткі — на 14,9 проц. У скрыначным цэху пра дукцыйнасьць працы павялічылася на 50 проц. Побач з гэтым значна павысілася і заработная плата рабочых.

Лепш за ўсіх падрыхтоўка да перавыбараў праводзіцца на фабрыцы «Дзьвіна». Для ўсебаковага высьвятленьня стану работы створана 12 самаправерачных брыгад. Перадаецца ў партыю 20 камсамольцаў, якія поўнасьцю апраўдалі сябе на вытворчасьці і на грамадзка-палітычнай рабоце. Лёзунг аб ператварэньні камсамолу ў шматмільённую арганізацыю на «Дзьвіне» выконваецца з посьпехам. За апошні час уцягнута ў камсамол 110 чалавек.

Парткалектывам фабрыкі «Дзьвіна» ўжо шмат чаго зроблена ў справе рэалізацыі 6-ці сталінскіх умоў: поўнасьцю ліквідавана абязьлічка варштатаў у часальным, істужкавым, мацальным і рамонтных цэхах і на старых ватэрах. У новых ватэрах арганізаваны 3 гаспадарча-разрахунковыя брыгады. У старым і новым істужкавых цэхах і на ватэрах уведзена прагрэсіўная зьдзельшчына і аплата працы робіцца паводле новага мэтаду. Гэты мэтад забясьпечвае ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі.

Мэтады работы парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна» і ячэйкі лесазаводу павінны стаць здабыткам усіх вытворчых партарганізацый Віцебшчыны.

Брыгада «Зьвязды» і «Віцебскага пралетара»: Арк. Зарубежны, Жыцьзьзіф, Брук, Бравін, Баравік, Керч.

Тав. ГЛЕЗЭР — член партыі, кіраўнік першай істужкі кушнернай фабрыкі «1 мая». Яго істужка датэрмінова выканала прамфінплян.

# ЯК „ЛЯВАЦКІЯ“ ЗАГІБЫ ЖЫВЯЦЬ ПРАВУЮ ПРАКТЫКУ

*„Калясьнік Талочыншчыны“, „Прымежны камунар“, Жытаквічы)*

«Разьмеркаваньне дахода́ў па прадпрыемствах—асноўнае зьвяно арганізацыі на-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, за якое зараз трэба ўхапіцца» (з адозвы ЦК КП(б)Б).

Аднак, некаторыя раённыя газэты не разумеюць новых задач, новых лёзунгаў, не разумеюць асноўнага, што праблема якасьці работы, арганізацыі на-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — зьяўляецца цэнтральнай задачай у калгасным будаўніцтве.

* * *

Раённая газэта «Калгасьнік Талочыншчыны» не змагаецца за сваячасовае і правільнае разьмеркаваньне дахода́ў, за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Талочынскі раён мае 72,3 проц. калектывізацыі. Усё-ж такі газэта на працягу апошніх трох месяцаў бе ў адзін пункт: ...хутчэй... хутчэй... і хутчэй дабіцца суцэльнай калектывізацыі. «Калгасьнік Талочыншчыны» патрабуе:

«Сапраўднага бальшавіцкага выкананьня пастановы чэрвеньскага пленуму РК КП(б)Б аб калектывізацыі 75 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да канца гэтага году. (24 жніўня). За 100 проц. калектывізацыю на Азырацкім сельсавеце (1 верасьня). Рашуча змагацца за выкананьне задач аб завяршэньні суцэльнай калектывізацыі (19 верасьня). Асноўнымі задачамі «дня ўраджаю і калектывізацыі» зьяўляюцца: 1) далейшае арганізацыйнае і гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, 2) барацьба за ўцягненьне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы (11 кастрычніка)».

Па раёне налічваецца 327 невялікіх калгасаў (у сярэднім па 32 гаспадаркі на кожны калгас), з якіх у 87 калгасах не арганізавана прапа, ня ўведзена зьдзельшчына, зусім адсутнічае ўлік працадзён. Пры такім становішчы з асаблівай упартасьцю трэба было змагацца за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, а ня гнацца за лутымі процантамі калектывізацыі. «Калгасьнік Талочыншчыны» супроцьстаўляе гаспадарчае ўмацаваньне новаму прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Рэдакцыя гэтай газэты ніяк ня можа зразумець, што толькі на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня існуючых калгасаў мы дасягнем завяршэньня суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове каначатковай ліквідацыі кулацтва як класы. Той, хто памяняе зараз гаспадарчае ўмацаваньне пагоняй за лутымі процантамі калектывізацыі, той скажае дырэктывы партыі, дапускае «лявацкія» загібы.

«Пойдзеш налева, прыдзеш направа». Так і адбылося на практыцы з «Калгасьнікам Талочыншчыны».

Толькі 11 кастрычніка «Калгасьнік Талочыншчыны» нарэшце адважыўся даць першую (!) і такую ж апошнюю падборку аб разьмеркаваньні ўраджаю. «Загадаўшы» 327 калгасам «не пазьней 14-га кастрычніка (г. зн. у 3-хдзённы тэрмін. —рэд.) скласьці і абгаварыць праекты разьмеркаваньня»—зноў настала магільнае маўчаньне, бо, мусіць, па думцы газэты, па Талочынскіх шыпках усё спакойна. Ніводнай пастановы партыі, ураду, калгасна-зямельных органаў газэта па сваіх старонках не зьмясьціла, ніводнага паказу прыкладнага разьмеркаваньня. Самае грубае ігнараваньне, стаўка на самацёк, недаацэнка гаспадарча-палітычнага значэньня кампаніі разьмеркаваньня дахода́ў,—вось шлях «Калгасьніка Талочыншчыны». Газэта не зразумела цэнтральнай задачы, не ўхапілася за асноўнае зьвяно і гэтым самым праявіла махровы апартунізм у пытаньні арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

«Калгасьнік Талочыншчыны» можа служыць прыкладам, як «лявацкія» загібы (пагоня за лутымі процантамі калектывізацыі) жыўляць праваапартуністычную практыку.

* * *

«Прымежны камунар»—орган Жытаквіцкага райкому КП(б)Б.

5 кастрычніка зьмяшчае прыкладнае разьмеркаваньне дахода́ў у калгасе імя Сталіна. У праекце дапушчаны грубыя палітычныя памылкі. «Зьвязда» сваячасова сыгналізавала аб памылках (17 кастрычніка). Перадрукаваўшы артыкул «Зьвязды» (20 кастрычніка № 33) рэдакцыя робіць ад сябе заўвагу:

«Газэта «Прымежны камунар» дапусьціла грубую памылку, зьмясьціўшы без заўваг прыкладнае разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасе імя Сталіна. Райкалгассаюзу трэба зараз-жа выправіць памылкі, дапушчаныя пры разьмеркаваньні».

«П. К.» кіўнуў у бок райкалгассаюзу: «хай ён выпраўляе, а я буду маўчаць».

Гэта ня мэтад бальшавіцкага друку. Рэдакцыя павінна была даць разгорнутую крытыку як сваіх уласных памылак, так і памылак, дапушчаных усёй калгаснай сыстэмай пры правядзеньні разьмеркаваньня. Гэтага ня зроблена. Для крытыкі і выпраўленьня памылак не знайшлося месца, у той час, як побач з заўвагай «П. К.» зьмяшчаецца артыкул «Вялізарнейшая перамога савецкай оптыка-мэханічнай прамысловасьці», які займае паўстаронкі раённай газэты. Няўжо для жытаквіцкіх калгасаў, для райпартарганізацыі і самой газэты актуальнай зьяўляецца праблема оптыка-мэханічнай прамысловасьці, а не практычнае вырашэньне пытаньняў жывлагадоўлі, разьмеркаваньня, сваячасовага выкананьня плянаў загатовак і г.д.

У апошнім нумары «Прымежнага камунара» (ад 25 кастрычніка) аб разьмеркаваньні дахода́ў — зноў ні слова. Затое на першай старонцы квітнее шапка «Сьвята 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі сустрэнем арганізацыйнай повага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы». Тут-жа падаецца пастанова бюро Жытаквіцкага РК КП(б)Б па дакладу інструктара ЦК тав. Галодка, у якой гаворыцца, што

«па Руднянскім сельсавеце былю дапушчана грубое скрыўленьне лініі партыі і савецкай улады, якое выявілася ў арганізацыі калгасу ў вёсцы Млынок праз запалохваньне, давядзеньне цьвёрдых заданьняў з абяцаньнем, што пры ўступленьні ў калгас цьвёрдыя заданьні будуць зьнімацца».

Зьмясьціўшы пастанову бюро РК «Прымежны камунар» ні ў шапцы, ні ў перадавым артыкуле не завастрыў увагі партыйнай арганізацыі на барацьбе на два фронты, ня выступіў супроць антысярэдняцкіх перагібаў, якія жывяць правую практыку. Газэта забылася, што жорсткая клясавая барацьба працягваецца, што павінна весьсіся бязьлітасная барацьба супроць кулака і яго правых, так і «левых» агентаў, якія дапамагаюць кулаку разбураць калгасы з сярэдзіны. Гэта гаворыць за тое, што «П. К.» сам апынуўся ў палоне апартунізму.

Газэта не мабілізуе актыўнасьці калгасных мас на сваячасовае выкананьне плянаў па збожжазагатоўках, не выкрывае і не патрабуе прыцягненьня да суровай адказнасьці апартуністаў, якія зрываюць выкананьне плянаў загатовак.

Сваю безадказнасьць, бязьдзейнасьць «Прымежны камунар» тлумачыць наступным:

«Рэдка калі можна атрымаць ад якой-небудзь арганізацыі зводку аб ходзе кампаніі і то трэба разоў дваццаць зрабіць напамінак, а крытычнага матар'ялу яны ніколі не даюць. Нашы адказныя работнікі баяцца даваць зводкі і іншы матар'ялы, каб гэтым самым ня выявіць сваёй бязьдзейнасьці» (№ 32).

Арыгінальнае тлумачэньне. Адказныя работнікі вестак не даюць, крытыкаваць самі сябе ня хочуць, дык і газэта можа маўчаць, чакаць ля моры пагоды і спакойна займацца вырашэньнем праблемы «оптыка-мэханічнай прамысловасьці».

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што «Прымежны камунар» ня стаў вострай зброяй партыі ў барацьбе з апартуністамі розных масьцей, якія зрываюць пляны загатовак. Газэта ня выступіла супроць месьніцкіх, рвацкіх буржуазных тэндэнцый у загатоўках.

Далейшая работа «П. К.» будзе ацэньвацца па тым, наколькі газэта зараз-жа перабудуе сваю работу ў адпаведнасьці з выкананьнем баявых задач, пастаўленых партыяй,—рашучае змаганьне на два фронты, мабілізацыя мас на поўнае выкананьне плянаў загатовак у вызначаны ўрадам тэрмін, правільнае правядзеньне разьмеркаваньня ўраджаю, падрыхтоўка жывёлы да зімоўкі, ад чаго залежыць выкананьне цэнтральнай задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

*Е. КАРЛОУСКІ.*

# Нарастае рэвалюцыйная хваля рашаючых клясавых баёў у Польшчы

**Прадукцыя скарацілася на адну трэць. У Верхняй Сілезіі мартэнаўскія печы і пракатныя цэхі ў кастрычніку працавалі ўсяго 5-8 дзён. Спажываньне тэкстылю, абутку і цукру зьменшылася на 50 проц. Інфляцыя—актуальнае пытаньне. Рогрос сельскай гаспадаркі. Дзенны заработак працуючага члена сялянскай сям'і роўны 3,1 кап. 5 мільёнаў «лішніх» рабочых батракоў на вёсцы. Капітал шукае выхаду з крызісу за кошт працоўных. Скарачэньне зарплаты на 30-50 проц. Вёска стогне пад падатковым прэсам. Польская ваенчына ўзмоцнена рыхтуецца да антысавецкай вайны. Аб'яднаньне кіраўніцтва польскай і румынскай армій—канкрэтны рэзультат «лячэньня» Пілсудскага ў Румыніі. Пад кіраўніцтвам КПП рабоча-сялянскія масы падымаюцца на рашучы бой за зьнярэньне фашысцкай дыктатуры.**

Прэм'ер Прыстор заявіў у польскім сойме, што прадукцыя прамысловасьці ў Польшчы зьнізілася параўнальна з гадамі добрай кан'юнктуры ў 1928-1929 г. на адну трэць. Заводы закрываюцца адзін за другім. На буйнейшых мэталюргічных заводах Верхняй Сілезіі мартэнаўскія печы і пракатныя цэхі працавалі ў кастрычніку ўсяго 5-8 дзён. Паводле афіцыяльных даных, у Польшчы стаіць 48 мэталяапрацоўчых заводаў, 30 машынабудаўнічых, 130 цагельняў, 171 лесапільных, 8 нафтаперагоначных, 10 паняровых, 6 цэментных і г. д.

Унутраны гандаль скараціўся да мізэрных разьмераў. Як сьцьвярджаюць буржуазныя газэты, попыт на цукар, на мануфактуру, на абутак і інш. скараціўся ва ўсёй краіне на 50 проц. параўнальна з 1929 годам.

Замежны гандаль Польшчы скараціўся ў адным толькі апошнім годзе на 20 проц. Крах ангельскай валюты і зарастраньне крызісу ў Нямеччыне балюча ўдарылі па польскім экспарце, узмацняючы яшчэ больш крызіс у Польшчы.

Пад уплывам банкрутства буйнейшых банкаў (Камэрцыйны банк у Лодзі, банк Штадтгагена ў Прыморскай акрузе) і крахаў такіх буйнейшых прадпрыемстваў, як Віхеўская мануфактура, Гросьляйт, Пэ-Пэ-Ге і інш. панічныя настроі пачалі ахапляць усё больш шырокія колы польскай буржуазіі. Уцечка капіталаў з банкаў набыла пагражаючы характар. За апошні пэрыяд забрана з банкаў, ашчадкас і інш. капіталаў на агульную суму 800 мільёнаў злотых, г. зн. прыблізна столькі-ж, колькі цяпер ёсьць у рэзэрвовым фондзе польскага дзяржбанку. Замежныя пазыкі, атрымяныя ўрадам на кабальных умовах, пазыкі, ад якіх патыхае крымінальнічнай — зьедзены. Рэзэрвовы валютны фонд сыстэматычна скарачаецца. Дзяржаўны бюджэт, ня гледзячы на зьніжэньне акладаў служачым, і іншым падобным мэрам «эканоміі» за кошт працоўных даў вельмі салідную шчыліну.

Усё часьцей чутны галасы польскіх фабрыкантаў і сацыял-фашыстаў, якія заклікаюць на дапамогу інфляцыю.

Па глыбіні аграрнага крызісу Польшча перагнала перадавыя капіталістычныя краіны Эўропы яшчэ ўлетку гэтага году. Пад ударам крызісу падаюць ня толькі дробныя га і сярэднія сялянскія гаспадаркі, якія прадаюцца з малатка за падатак і аперныя даўгі. Сума падатковых недоімкаў перавышае 1 млрд. злотых. Сума даўгоў перавышае 3 мільярды.

Нажніцы, якія існуюць паміж цэнамі на сельска-гаспадарчыя прадукты і прамтавары, дабіваюць сельскую гаспадарку. У той час, як да вайны селяніну за плут прыходзілася плаціць 135 кгр. жыта, цяпер — 321 кгр., за 100 кгр. солі—6 кгр. жыта, цяпер 26 кгр., за пару ботаў — 79 кгр. жыта. Усё гэта выклікае рогрос сельскай гаспадаркі ў Польшчы, на што паказвае катастрафічнае скарачэньне збыту штучных угнаеньняў і сельгасмашын. З 14 існуючых у Польшчы фабрык супэрфасфатаў працуе ўсяго адна. Збыт супэрфасфату, які ў мінулым годзе зьнізіўся да нізвычай нізкага ўзроўню—183.000 тон, у гэтым годзе яшчэ больш панізіўся і не перавышае за ўвесь год 70.000 тон.

Паводле падлікаў урадавага аграрнага інстытуту ў Пулавах, даходнасьць селяніна дробных і сярэдніх гаспадарак настолькі ўпала, што сярэдні дзенны заработак працуючага члена сялянскай сям'і роўны 12 грошам, г. зн. 3,1 кап.

Колькасьць беспрацоўных дасягнула да вясны гэтага году нізвычайнага яшчэ ў Польшчы ўзроўню: паводле афіцыяльных даных 380.000, па 100.000 больш, чым у мінулым годзе. У гэтым годзе, паводле аптымістычных падлікаў урату лік афіцыяльна зарэгістраваных беспрацоўных будзе ня ніжэй 400.000. Гэта паводле афіцыяльных даных. Па справе-ж у Польшчы было, нават, калі меркаваць па галасох буржуазнай прэсы, у сярэднім 1 млн. беспрацоўных. Сюды не ўваходзіць тая вялізарная колькасьць «лішніх» рабочых-батракоў на вёсцы, якіх увогуле ня менш 5 мільёнаў.

Увесь цяжар крызісу буржуазія перакідвае на плечы рабочай клясы і працоўных. Скарачэньне зарплаты на 30-40 проц., нават на 50 проц. стала штодзённым зьявішчам у Польшчы. Усюды маюць месца такія выпадкі, калі фабрыканты і памешчыкі месяцамі ня выплачваюць рабочым іх мізэрных заработкаў. Зьніжэньне зарплаты і невыплачваньне яе шырока ўжываецца ня толькі прыватнымі прадпрыемцамі, але і дзяржаўнымі ўстановамі і органамі гарадзкіх самакіраўніцтваў. Дзяржаўным служачым зьніжаны заработкі на 20-40 проц., камунальным рабочым і служачым—на 15-20 проц. Праводзяцца масавыя скарачэньні. Зьніжаюцца жабрацкія пэнсіі інвалідам. Дапамога беспрацоўным зьніжана на 10 проц., тэрмін выдачы дапамогі скарочаны з 17 да 13 тыдняў. Пачкамі выкідваюцца на вуліцу рабочыя і служачыя.

Падатковы прэс выціскае апошнія соки са зруйнаванага сялянства. У Лэмжынскай акрузе ёсьць вёскі, у якіх на 50 двароў прыходзіцца 84.000 злотых падатковых пядоімак. Польскі сойм, устанавіўшы ў кастрычніку цэлы рад новых падаткаў, прыняў пастанову аб спагнаньні падаткаў натураю.

Аднак, усе намаганьні буржуазіі «перачакаць крызіс», як гаворыць лёзунг польскай буржуазіі, не даюць ёй пажаданых рэзультатаў. Здань капітальнага краху, здань рэвалюцыі заграе ў вочы польскіх фашыстаў.

«Становішча катастрафічнае і з кожным днём яно будзе пагаршацца. «Нядзіва, што кожны пытае:—«Чым усё гэта скончыцца і што нас чакае» —пішна верхнасілезкая газэта «Полонія» і дадае: «Аб сацыяльна-палітычных рэзультатах катастрофы лічым за лепшае пакуль што не гаварыць нічога, хаця яны могуць мець ня меншае значэньне, чым сам гаспадарчы крах».

Бездапаможнасьць і страх выклікаюцца ў польскай буржуазіі тымі вялізарнымі зрухамі, якія адбываюцца ў рабочай клясе, у сялянскіх масах як польскіх, так і прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Рэвалюцыйны рух у Польшчы знаходзіцца ў стадыі шпаркага ўздыму.

Наступленьне капіталу сустракае ўсё больш рашучы адпор з боку мас. Наперакор упадніцкім тэорыям правых рэнэгатаў камунізму, рабочыя, пад кіраўніцтвам кампартыі і рэвалюцыйнага прафруху, давялі большасьць забастовак апошняга пэрыяду да пераможнага канца. Гэтыя выйтраныя забастоўкі маюць вялізарную мабілізацыйную сілу. Барацьба перакідваецца з адной галіны прамысловасьці ў другую, перарастаючы ў некаторых месцах у забастоўку ўсеагульную (Горадня, Беласток). Забастовачным рухам ахапляюцца асноўныя галіны прамысловасьці. Адбываецца рад забастовак на буйнейшых мэталюргічных заводах Верхняй Сілезіі і Дамброўскага басэйну.

Праявы зьезд рэфармісцкага прафсаюзу чытуначнікаў прымае пераважнай большасьцю галасоў рэзалюцыю рэвалюцыйнай прафпазыцыі аб абвяшчэньні ўсеагульнай чыгуначнай забастоўкі. Рухам ахоплены камунальнікі, забастоўку якіх у Варшаве сарвала ППС і ніжэйшыя дзяржаўныя служачыя (пашчтавікі і інш.). Абдываецца рад масавых забастовак у цэнтрах тэкстыльнай прамысловасьці і нават у ваеннай прамысловасьці (Бяла-Подляска).

Усё больш рашуча раўпецца па горадзе рэвалюцыйная вёска: даведзеныя глыбокім аграрным крызісам і палітыкай фашызму да роспачы, працоўныя сяляне ўсё больш актыўна выступаюць супроць падатковага цяжару і непасільных даўгоў. Барацьба сялянскіх мас скрозь і ўсюды прыводзіць да ўзброеных сутычак з органамі фашысцкай дыктатуры. Есьць у Польшчы цэлыя раёны, дзе 80 проц. сялян адмаўляюцца плаціць падаткі, выходзіць на прымусовыя работы на пабудове стратэгічных дарог, па так званыя «шарваркі». У цэлым радзе акруг паліцэйскія могуць паказвацца на вёсцы толькі па некалькі чалавек.

Яшчэ больш востра выступае рэвалюцыйная барацьба працоўных сялян у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі. Тут момант клясавай барацьбы надзвычай завастраецца нацыянальна-вызваленчай барацьбой супроць польскай акупацыі. Пераход мас у Заходняй Украіне ў контр-наступленьне выяўляецца ў масавых нападах памешчыцкай, кулацкай і дзяржаўнай маемасьці. Больш часты выпадкі пашкоджаньня чытуначнага палатна і тэлеграфна - тэлефоннай сеткі. Больш часты тэрарыстычныя замахі і выступленьні супроць нячавіных прадстаўнікоў фашысцкай улады. Нянавісьць мас пакіравана ня толькі супроць польскіх захватчыкаў, але і супроць «сваёй» буржуазіі, якая рукамі і нагамі адмахваецца ад рэвалюцыйных выступленьняў, што адбываюцца ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі.

Масы рашуча парываюць са здрадніцкімі правадырамі сацыял-народніцкіх і нацыянал-фашысцкіх партый. Больш часты выпадкі пераходу ў кампартыю рабочых і працоўных, якія знаходзяцца ў сацыял-фашысцкіх і іншых арганізацыях. Узмоцненая дэмагогія і балбатня абнаглеўшых здрадніка́ў аб «лячэньні» капіталізму, так сама як і іх паклёпніцкая кампанія супроць СССР, знаходзяць у масах усё менш прыхільнікаў і слухачоў.

Шчыліны пачынаюць зьяўляцца і ў самым апараце фашысцкай дзяржавы. Расьце нездавальненьне чыноўнікаў, якім скарацілі аклады і якіх пачкамі выкідаюць на вуліцу.

Значна скарачаюцца прыватныя масы фашысцкай дыктатуры. Развальваецца ў радзе мясцовасьцяй «Стралец», развальваюцца яўна фашысцкія партыі і саюзы. Адліў членаў з розных патрыятычных таварыстваў («Ліга газавай абароны» і інш.) набывае масавы характар. Бражэньне прасякнула нават у рады прэтарыянскай гвардыі фашызму, як гэта паказалі варожыя міністрам Пілсудскага дэманстрацыі, паладжаныя нізавымі дэлегатамі на зьезьдзе былых легіянэраў у Тарнове.

Да пасьпяваючых рэвалюцыйных падзей у Польшчы фашысцкая дыктатура ўзмоцнена рыхтуецца. Нікольні не адмаўляючыся ад манэўраў, наадварот, узмацняючы сваю дэмагогію, польскі фашызм асноўную стаўку робіць на абвастрэньне тэрору нічым незамаскаванага гвалту.

Фашысцкі ўрад абрушваецца на ўсе легальныя рэвалюцыйныя арганізацыі, закрываючы іх і жорстка прасьледуючы іх членаў. Ужываньне зброі і газавых бомбаў у адносінах да дэманстрацый рабочых і сялян стала звычайным зьявішчам. Дэкрэтам прэзыдэнта Польшча абвешчана фактычна на ваенным становішчы. Палявыя суды, якім прадастаўлена права ў «спрошчаным парадку» прысуджаць да павешаньня рэвалюцыйных рабочых і сялян,—ужо пачалі сваё крывавае жніво.

У сваёй барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху польскі фашызм галёўны агонь накіроўвае супроць рэвалюцыйнага авангарду, супроць кампартыі Польшчы.

У агні барацьбы кампартыя Польшчы пашырае свой уплыў і шпаркі павялічвае свае рады. Яна цьвёрда ўступіла на шлях ліквідацыі свайго арганізацыйнага аславаньня, мабілізуючы ў штодзённай барацьбе самых шырокія масы да рашаючых баёў за ўладу.

Эканамічны крызіс, які ўсё паглыбляецца і завастраецца, і рост прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы штурхае польскіх фашыстаў на шлях ваеннай авантуры супроць СССР. Ваенны бюджэт Польшчы, ня гледзячы на дэфіцыты, не скарачаецца. Ліхаманкава будуюцца стратэгічныя чыгункі. Скарачэньне прадукцыі амаль не закранула ваеннай прамысловасьці. Ня спыняюцца ўзаемныя візыты дыпляматаў і генштабістаў Польшчы, Францыі, Румыніі і інш. «Лячэньне» Пілсудскага ў Румыніі мае характар яўных перагавораў з румынскім генштабам аб адзіным каманаваньні пад кіраўніцтвам маршала Пілсудскага.

Завастрэньне фашысцкага тэрору таксама мае на ўвазе падрыхтоўку антысавецкай вайны. Недарма дэкрэт аб палявых судох узгадняўся з французкім урадам, які патрабуе ўстанаўленьня «парадку» ў Польшчы, якая пры значана французкімі і іншымі імпэрыялістамі для ролі ваеннага фарпосту ў антысавецкай інтэрвэнцыі.

Але пралетарыят і працоўныя Польшчы ня хочуць быць зброяй у руках імпэрыялістаў для задушэньня краіны сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам кампартыі пралетарыят і працоўныя Польшчы ўступаюць у паласу рашаючых баёў супроць антысавецкай інтэрвэнцыі, супроць фашысцкай дыктатуры, за савецкую Польшчу.

# Аб выкананьні касав..гапляну

## Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладах т. т. Хацкевіча і Шэрмана

Выкананьне народна-гаспадарчага пляну IV кварталу патрабуе максымальнага паступленьня наяўных грашовых сродкаў у дзяржаўныя касы і поўнага выкананьня па ўсіх крыніцах касавага пляну. Між тым, за 2 дэкады кастрычніка пры поўным выкананьні, а ў некаторых выпадках (па гаспадарча-апэрацыйных выдатках) і перавыкананьні расходнай часткі касавага пляну парушаецца сваячасовасьць забесьпячэньня грашовымі сродкамі выплаты заработнай платы, загатовак і іншых гаспадарчых мерапрыемстваў.

У матах пікідацкі разрыву ў касавым пляне і сваячасовага фінансаваньня ўсіх гаспадарчых мерапрыемстваў, — Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанавіў:

1. Прапанаваць Народнаму камісарыяту фінансаў і Усебеларускай канторы Дзяржбанку арганізаваць і неаслабна праводзіць самы жорсткі кантроль за выкананьнем расходнай часткі касавага пляну ўстаноў і гаспадарчых арганізацый, ні ў якім разе не дапускаць перавышэньня ўстаноўленых плянаў і каштарысаў, пастаўшы расходы кожнай арганізацыі ў простую залежнасьць ад выкананьня даходнай часткі яе фінансавага пляну.

2. Адзначаючы зусім ненармальнае становішча, калі фонды заработнай платы па ўстановах і гаспадарчых арганізацыях сыстэматычна перавышаюць устаноўленыя пляны, а таксама недапушчальнае перавыдаткаваньне сродкаў на гаспадарча-апэрацыйныя патрэбы,— абавязаць кіраўніцтвы усіх устаноў і арганізацый безадкладна зьнішчыць гэтыя ненармальнасьці, строга абмежаваўшы фонд заработнай платы і гаспадарча-апэрацыйныя выдаткі рамкамі ўстаноўленых плянаў і каштарысаў.

3. Прапанаваць прэзыдыуму праўленьня Белкаапсаюзу, праўленьням пасобных гандлёвых аб'яднаньняў і Белтандлю безадкладна прыняць рашучыя меры да пашырэньня рэалізацыі тавараў, шляхам паскарэньня тавараабароту, максымальнага скарачэньня тавараных астаткаў і разбраніраваньня фондаў, якія ка маюць тэрміковага мэтавага прызначэньня:

а) Пацьвердзіць натэгарычную дырэктыву аб тым, што тавары па браніраваных фондах могуць браніравацца на тэрмін, які не перавышае 16 дзён, пасьля скончэньня якога тавары павінны рэалізавацца.

б) Прапанаваць Белкаапсаюзу безадкладна рэалізаваць рэшткі запасаў тавараў з пайковага фонду па цьвёрдых цэнах, прымаючы пры гэтым пад увагу за бесьпячэньне патрэб ЗРК.

в) Абавязаючы БКС няўхільна выконваць дырэктывы аб забароне сыстэме спажывецкай кааперацыі займацца рэалізацыяй тавараў па камэрцыйных цэнах, — прапанаваць БКС рэшткі камэрцыйных тавараў рэалізаваць у бліжэйшыя 5 дзён па пэніжаных цэнах, згодна пастановы камітэту цэн СПА.

г) Абавязаць памянёныя арганізацыі безадкладна выканаць пастанову Камітэту цэн пры СПА па зьніжэньні цэн на камэрцыйныя тавары.

4. Прапанаваць ВСНГБел наўныя залежы тавараў у 10-дзённы тэрмін перадаць кааперацыі для рэалізацыі.

Адначасова зьвярнуць увагу ВСНГБел на невыкананьне Белшкловаб'яднаньнем дырэктывы аб перадачы кааперацыі для рэалізацыі тавараў на 250 тыс. руб.

5. Прапанаваць Беларускай канторы Дзяржбанку забясьпечыць бесьперабойную выплату заработнай платы рабочым і пікідаваць запазычанасьць па заработнай плаце.

6. Адзначаючы недапушчальныя выпадкі парушэньня касавай дысцыпліны, што з боку бакалейна-гастранамічнага аб'яднаньня Белкаапсаюзу вызначылася ў дачы престай дырэктывы па сваёй сетцы аб затрыманьні і ня здачы ў каставараў, — абавязаць кааперацыйныя і гандлёвыя арганізацыі, пад непасрэдную адказнасьць іх кіраўнікоў, забясьпечыць безадкладную здачу выручкі ў касы Дзяржбанку.

Справу аб бакалейна-гастранамічным аб'яднаньні Белкаапсаюзу перадаць ЦКК НК-РСІ для тэрміновага расьсьледаваньня і прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

7. Прымаючы пад увагу выключнае значэньне сваячасовага і поўнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва, а таксама нездавальняючы ход выкананьня пляну, асабліва па лініі добраахвотных плацяжоў (ашчадкасы, дзяржпазыкі).

а) Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў, райкомам, гаркомам фракцыям РВК і гарсаветаў рашуча ўзмацніць работу ў гэтай галіне, дабіваючыся 100 проц. з дэкады ў дэкаду выкананьня пляну.

б) Прапанаваць ГК і РК не мабілізоўваць адказных фінансавых работнікаў і работнікаў ашчадкас на іншыя кампаніі.

Даручыць сэктару кадраў ЦК прыняць рашучыя меры да выкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б аб мабілізацыі партыйных работнікаў на фінансавую працу і ў дэкадны тэрмін паведаміць Сакратар'яту ЦК аб выкананьні.

в) Прапанаваць райкомам і гаркомам усіх работнікаў, скончыўшых у гэтым годзе курсы па ашчадсправе, поўнасьцю скарыстаць па прызначэньні, забясьпечыўшы выкананьне дырэктыў ЦК і СНК аб пашырэньні сеткі ашчадкас.

г) Прапанаваць райкомам і фракцыям РВК рашуча узмацніць дзейнасьць нізавых камісій сацбезпекі ашчадсправе і дзяржкрэдыту, пераглядзеўшы іх персанальны склад і дабіцца канкрэтнай актыўнай работы фінансавых сэкцый пры саветах і выканаўчых камітэтах у галіне выкананьня фінансавага пляну.

д) Абавязаць Белкалгасцэнтр забясьпечыць падтрыманьне і актыўную дапамогу з боку калгаснай сыстэмы ўсім ашчадным касам, якія арганізуюцца па калгасах і іншых вясковых мясцовасьцях.

Даручыць фракцыі ЦСПСБ забясьпечыць па прафсэкцыянальнай лініі сыстэматычную дапамогу і пралетарскі кантроль над работай сыстэмы ашчадкас і дзяржкрэдыту.

9. Прапанаваць сэктарам кантролю за выкананьнем і нтральных устаноў няўхільна сачыць за ажыцьцяўленьнем дырэктыў па выкананьні фінпляну і мабілізацыі сродкаў і сваячасова паведамляць аб фактах невыкананьня дырэктыў і пастаноў.

# Кіраўніцтва Белмяса недаацэньвае плянаваньня,

## ІГНАРУЕ ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК

Усямернае паляпшэньне работы і поўнае выкарыстаньне існуючых мясакамбінатаў, бэконных і каўбасных фабрык, бойнёвых прадпрыемстваў і кансэрвовых заводаў вызначаецца зараз важнейшай задачай.

Гэта з асаблівай сілай падкрэслена ў алозьве ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці.

Пятгары месяцы, якія прайшлі з часу апублікаваньня алозвы, паказалі, што Белмяса вельмі марудна перабудоўвае сваю работу. Фактычна нічога ня зроблена для паляпшэньня работы мясной прамысловасьці БССР.

### Замест апэрацыйнага кіраўніцтва—штампаванье цыркуляраў

Апарат Белмяса замест апэрацыйнага кіраўніцтва прадпрыемствамі займаецца штампаваньнем часта блытаных і незразумелых цыркуляраў і інструкцый Саюзмяса.

У адным з асноўных аддзелаў Белмяса—вытворчым работа арганізавана так, што паасобныя групы прадаўнікоў фармальна адказваюць за той ці іншы вучастак работы, а фактычна існуе ўсяная абязьлічка.

Вось факты: кішачная група абавязана ня толькі сачыць за якасьцю прадукцыі мясных прадпрыемстваў, але адказваць і за выкананьне прамфінпляну ў цэлым. На справе-ж гэтым ніхто. У сувязі з вялікім патокам жывёлы на мясакамбінаты, поўная і сваячасовая апрацоўка кішак набывае вельмі важнае значэньне. Спэцыялістаў-кішачнікаў у БССР мала, але кішачная група ня прымае практычных мэр для запрашэньня спэцыялістаў з іншых раёнаў, наколькі гэта «не ўваходзіць у яе функцыі». А група кадраў абмежавалася тым, што напісала паперку ў Варошэскі раён, дзе спэцыялісты-кішачнікі ёсьць у выстарчальнай колькасьці, і на гэтым спыніла свае клопаты аб кадрах. Між тым становішча з кадрамі пагражаючае—не хапае 40 работнікаў.

Такія-ж «пяўвізкі» ў справе забесьпячэньня рабочых спэцвопраткай. Кішачная група вырашае гэта пытаньне вельмі проста. Яна адсылае заяўкі ў іншы сэктар Белмяса і лічыць справу скончанай. Ня прымаецца ніякіх мер, каб прасачыць і праверыць, як выконваюцца паданыя заяўкі. Да чаго прыкладна такая «работа» кішачнай групы, паказвае тое, што з 37 кішачнікаў, якія прыбылі на Аршанскі мясакамбінат, на рабоце засталіся толькі 6. Рэшта перайшла на іншыя прадпрыемствы.

Нахент сыстэмы зарплаты і норм выпрацоўкі ёсьць выразныя дырэктывы, але кожны мясакамбінат чамусьці ўводзіць сваю сыстэму. Так, на Менскім камбінаце за спуск 120 штук гавяжых чэрэў плоцілца 3½ кап., а ў Воршы—1½ кап.

### „... Тады складзем плян"

Асабліва абураюча тое, што мясная прамысловасьць БССР фактычна працуе без прамфінпляну. У другім паўгодзьдзі 1931 г. адзіным вымярэньнікам работы мясных прадпрыемстваў выяўляюцца кантрольныя лічбы жывёлазагатовак. Плян на 1932 год абгазоравецца і складаецца не на прадпрыемствах, а ў габлістах Белмяса, бяз удзелу рабочых мясакамбінатаў і ІТР.

Некаторыя кіруючыя работнікі Белмяса праяўляюць апартуністычную недаацэнку пляну і лічаць, што плянаваньне сыстэмы мясной прамысловасьці немагчымая і непатрэбная рэч. Такія ніводныя разважаньні і стаўка на самацёк маюць месца ня толькі ў апарце Белмяса, але і ў падпарадкаваных яму мясакамбінатах.

На Менскім мясакамбінаце ўсе справаздачы складаюцца бяз усякага ўліку якасных паказальнікаў, асабліва па выніжэньні сабекошту. Калі спэцыялісты камбінату зьвярнуліся да адміністрацыі з прапановай дапамагчы складзі прамфінпляну на IV квартал 1931 г. і 1932 г., дырэктар заявіў: «дастанем плянавіка, тады складзем плян». Як відаць, дырэктыя мясакамбінату, як і кіраўніцтва Белмяса, лічаць, што ва ўмовах мясакамбінатаў не патрэбна складаць прамфінпляну, «бо ўсё роўна прыдзецца часта яго мяняць». А наколькі няма прамфінпляну, няма барацьбы за выкананьне якасных паказальнікаў, за ўкараненьне сапраўднага гаспадарчага разрахунку.

Самацёк, адсутнасьць належнага ўліку і праверкі паўнуюць у рабоце другога буйнога прадпрыемства—Аршанскага мясакамбінату. Гэты камбінат таксама ня мае апэрацыйнага пляну. Няма каляндарных плянаў здачы сэўгасамі і калгасамі прадукцыйнай жывёлы. У выніку часта бывае, што на камбінат паступаюць вельмі шмат жывёлы, якая стаіць там па некалькі дзён, траціць вагу і гэтым самым прыносіць дзяржаве вялікія страты.

Жывёлазагатоўкі маюць рашаючае значэньне ў выкананьні Белмясам сваіх заданьняў. Чамусьці Белмяса ў дагаворы з Белжывёлсаюзам і Белкаапсаюзам выпусьціла такі пункт, як зазначэньне лікальных дагавораў паміж раённымі загатоўчымі арганізацыямі і камбінатамі. Адсутнасьць такіх умоў прыводзіць да таго, што фактычна мясакамбінаты ня маюць ніякага ўплыву на ход загатовак, і толькі ўмяшаньне ў гэту справу Наркамснабу выправіла гэты буйнейшы недахоп.

Важнейшае ўказаньне тав. Сталіна аб гаспадарчым разрахунку не знайшло практычнага адбітку ў Белмясе і яго зьвеньнях. Ня гледзячы на тое, што на Менскім мясакамбінаце ёсьць усе магчымасьці перавесьці цэхі на гаспадарчы разрахунак, ніякіх крокаў у гэтым напрамку ня робіцца. З 15 цэхаў толькі 2 выбіраюцца перавесьці на гаспадарчы разрахунак. Такое ігнараваньне дырэктывы партыі аб кантролі рублём самым горшым чынам адбіваецца на рабоце прадпрыемстваў мясной прамысловасьці.

Белмяса фактычна не прыступіла да рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці. Гэта адбілася і на перабудове работы мясакамбінатаў.

На тормазным заводзе (Масква). Буфэт, адкрыты ЗРК у адным з цэхаў заводу

### Чаму гінуць тоны каштоўных адыходаў?

Возьмем зноў такі Менскі камбінат. За апошні час ён дабіўся паўных посьпехаў на паасобных вучастках работы. Так, па адымцы скур брак зьніжан з 30 проц. да 1 проц. У кішачным цэху выпрацоўка экспартнага кішэчнику давядзена да 98 проц. Альбуміндны пэх займае другое месца ў СССР. Праведзена значная работа па паляпшэньні культурна-бытавых умоў рабочых.

Але сучасная становішча камбінату, асабліва быкабойнага і сьвінабойнага цэхаў, ні ў якім разе не адпавядае ўзрастаючым запатрабаваньням у пераапрацоўцы мясной прадукцыі. Далёка ня поўнасьцю выкарыстоўваецца нова-пабудаваныя цэхі каўбасной фабрыкі, кішэчнаму, халадзільніка.

Няма ўвязкі паміж паасобнымі цэхамі. У той час, як жывёлабойня пралускае 350 штук у суткі, утылізацыйны і альбуміны цэхі могуць прапусьціць толькі палову гэтай колькасьці. Па гэтай прычыне бываюць выпадкі псаваньня прадукцыі і выпоўнага выкарыстаньня крыві, сала і г. д.

Рад вытворчых неплядлак б'юць па ўсёй рабоце. З-за адсутнасьці вентылятара ў альбуміндным цэху пераварае каля 15 проц. крыві, з якое вырабляецца вельмі вэзная экспартны прадукт. Тольні цяпер аб гэтым падумалі.

Агідным трэба лічыць зусім неадпаведнае выкарыстаньне адыходаў ад вытворчасьці. Штодзённа гіне каля 1 тоны розных каштоўных адыходаў, якія пераробляцца прыватнікам, а не выкарыстоўваюцца для сьвінаадкормачных пунктаў кааперацыі і г. д. Незыкарыстоўваюцца шлямы, з якіх можна вырабляць клей, кацгуты кішак—для пасаў, каныга—для вырабу абвёртачнай паперы і г. д.

Трыкутнік камбінату, асабліва бюро партклектыву, далёка ня ў поўнай меры пераключылі сваю работу на рэалізацыю пасьці ўказаньняў тав. Сталіна, Прамова тав. Сталіна і алозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб мясной і кансэрвовай прамысловасьці бюро клектыву. нават не прапрацавана. Асноўным пунктам сацпаборніцтва і ўдарніцтва ў большасьці выпадкаў зьяўляюцца толькі колькасныя паказальнікі.

На працягу году партклектыў не заслухаў ніводнай справаздачы фракцыі заўкому і бюро цэх'ячэек. На вытворчасьці зусім не адчуваецца работа камсамольскай арганізацыі. Кіраўніцтва партыйнай і камсамольскай арганізацыі вельмі часта прымірэнча адносіцца да хваравітых зьявішч на вытворчасьці.

Апарат Белмяса і яго зьвеньні на мясцох павінны безадкладна перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з указаньнямі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР. Трэба самым рашучым чынам ударыць па самацёчных настроях, па апартуністычным ігнараваньні пляну і гаспадарчага разрахунку. Перад партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі мясной прамысловасьці стаіць баявая задача—выправіць на-хаду ўсе недахопы і мабілізаваць рабочыя масы на поўнае выкананьне алозвы партыі і ўраду і асабліва на якасных паказальніках работы. Трэба ўзмацніць барацьбу за ўдасканаленьне тэхнікай, за сапраўднае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку і прагрэсыўнапрэміяльнай зьдзельшчыны.

**Міх. Кін, З. Левін.**

# „Нашай мясцовасьці перабудова не датычыць"

Пасьля майскай адозвы ЦК партыі і ўраду рагачоўскія кааператары як быццам узварушыліся. Абгаварылі мерапрыемствы па пераводзе гандлёвай сеткі на гаспадарчы разрахунак, вызначылі пункты і... на гэтым супакоіліся.

Далейшая практыка работы райспажыўсаюзу і гарспажыўсаюзу паказала, што некаторыя зьвеньні гэтых арганізацый замест перабудовы пайшлі па шляху буржуазнага гандлярства і ўпарта ігнаруюць дырэктывы партыі аб разгортваньні савецкага гандлю.

«Нас, як сельскай мясцовасьці, перабудова не датычыць, мы нічога зрабіць ня можам»—вось адказ, які можна атрымаць ад кааперацыйных работнікаў на запытаньне аб перабудове работы кааперацыі.

За 9 месяцаў уся ініцыятыва мясцовай кааперацыі вывялася ў тым, што работнікі недзе зьезьдзілі, павезьлі гатовага адзеньня і прадалі па камэрцыйных цэнах. Забесьпячэньне-ж закрытых разьмеркавальнікаў пры прадпрыемствах і ўдарнікаў зусім выпала з-пад увагі кааперацыі.

У гарспажыўтаварыстве няма паваг такога тавару, як цукеркі. Гарспажыўтаварыства кожны раз зварачаецца да чыгуначнага кааператыву, які адпускае па скрынцы цукерак для задаваленьня сталовак.

Трэба выкінуць з апарату рагачоўскага спажыўсаюзу апартуністычныя элементы, якія перашкаджаюць выкананьню дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове працы кааперацыі.

**Касаткін.**

*Янка Купала*

# Дзе крыўда адвечная сьпела

Дзе крыўда адвечная сьпела,
Дзе сыпала гора курганы,
Рукой пралетарскаю сьмелай.
Гнілы стары лад зруйнаваны.

Мінулася цемры навала,
Электрыка рвецца ў вяконцы;
Мужычая ночка сканала,
Узьнялося калгаснае сонца.

Сялянскае, панскае поле
Ня стогне ў няволі сягонькя,
Ня блукае ў полі нядоля,
Пасуцца жалезныя коні.

Калгасьнік усьсеўся на трактар,
Стаптаўшы мінулага імя,
Зямлі каравісты характар
Нарогамі стружа стальнымі.

За скібаю скібу, як стружкі,
Машына умелая сьцеле...
Над нівай вясёлыя птушкі
Па - іншаму песьні запелі,

Чырыкаюць дружна з заўзяцьцем
Па самы кастрычнік ад мая:
«Паўстаў катаваны пракляцьцем,
Што трэба рабіць яму, знае».

Менск, 1931 г.

# Укараніць у дарожнае будаўніцтва

## НАВЕИШЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ ТЭХНІКІ

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі БССР і рост прамысловасьці патрабуюць разьвіцьця транспартнай сувязі.

Галоўнае месца ў паляпшэньні сувязі павінен заняць аўтадарожны транспарт. Вось чаму праблема правільнага вызначэньня сеткі, як асноўных магістраляй, пад'язных шляхоўтак, і раённых дарог, патрабуе сур'ёзнай прапрацоўкі.

Стварэньне танных тыпаў дарожнай вопраткі, шляхам скарыстаньня ўсіх унутраных сырцовых рэсурсаў, а таксама выбар эканамічна выгаднага тыпу брукі з прывозных матар'ялаў — зарука вырашэньня пастаўленых задач.

Для прапрацоўкі ўсіх гэтых праблем Саўнаркома БССР арганізаваў навукова-дасьледчы аўтадарожны інстытут Галоўдартрансу.

У першую чаргу неабходна дасьледваць грунты, з пункту погляду іх прыгоднасьць для палатна дарогі. У гэтых адносінах заслугоўвае ўвагі ты повыя для БССР пяскі і суглінкі. Перад Інстытутам стаіць задача пераапрацаваць пытаньне аб іх паляпшэньні, шляхам «глінаваньня» і «пескаваньня», г. зн. інтучнага давядзеньня механічнага складу зямлі да сумесі, якая-б дала добрую дарогу і ліквідавала так званае «дарожнае разводзьдзе».

Ня менш важнай задачай зьяўляецца выкарыстаньне нетраў нашых балот для паляпшэньня дарог. Торф можа ўжывацца для паляпшэньня грунтавых дарог на пясчаных глебах.

Дасьледваньні паказалі таксама, што маса ніжніх пластоў балот (сапраналіты) маюць дастатковую колькасьць смалістых матэрый, прыгодных для ўжываньня ў дарожнай справе як для палепшаньня грунтовых дарог (прамасьліваньне), так і для пабудовы ўдасканаленых камэнна-дзёгцевых пакрыцьцяў.

Адсутнасьць карэнных месцанараджэньняў камня, а таксама недастатковасьць валунных залежаў на тэрыторыі БССР прымушае зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на гравій для скарыстаньня яго, як дарожна-будаўнічага матар'ялу. Практыка паказала, што ў значнай частцы раёнаў ёсьць шмат гравія. Так, дасьледваньні інстытуту выявілі, што ў раёне былой Менскай акругі ёсьць каля 250 тыс. кбм. гравійнага матар'ялу, што можа даць каля 200 клм. гравійных дарог. Трэба адзначыць, што ўжываньне гравія на будаўніцтве дарог яшчэ не заняло належнага месца, бо ня было ў гэтай галіне дастатковага вопыту. Вось чаму Дасьледы Дарожны Інстытут зараз ставіць перад сабой важнейшую задачу — выявіць наяўныя запасы травія з тым, каб максымальна скарыстаць яго для дарожнай вопраткі.

У радзе раёнаў БССР клінкерныя гліны зьяўляюцца адзіным відам мясцовага сырцу для дарожнага будаўніцтва. Клінкерная вопратка дарог павінна заваяваць адно з першых месц. У гэтай галіне работа інстытуту будзе накіравана на выпуканьне, дасьледваньне і выбар найбольш прыгоднага матар'ялу для клінкеру, а таксама на выбар раёнаў, прыгодных для разгортваньня клінкернай прамысловасьці.

Ня менш важнай задачай зьяўляюцца пытаньні мэханізацыі, стандартызацыі дарожнага будаўніцтва, пастаноўкі на належную вышыню аўтамабільна-гаражнай гаспадаркі.

Апрача гэтага Інстытут павінен стаць штабам сучаснай тэхнічнай думкі ў галіне аўтадарожнага транспарту, папулярызаваць дасягненьні як савецкай, так і заменай дарожнай тэхнікі.

Пралетарская грамадзкасьць павінна дапамагчы Інстытуту ў яго рабоце.

**Уласенка.**



КУЗБАС. Цэнтраэлектрацэнтраль у часе будаўніцтва.

# На віне заводу „Дубіцель"— працуе з перабоямі гарбарня імя Сталіна

## Адкрыты піст да ўсіх рабочых, ІТР і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу Рэчыцкага заводу „Дубіцель"

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Магілёўская гарбарня імя Сталіна ўключылася ў Сталінскую эстафету 4-га году пяцігодкі і ва ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства па выкананьні прамфінпляну за 2-е паўгодзьдзе, абвешчаны ЦК саюзу гарбароў і ўсесаюзным Скураб'яднаньнем. Мы абавязаліся датэрміново НА ДЭКАДУ выканаць прамфінплян апошняга кварталу трэцяга рашаючага году.

Але, тое становішча, у якім зараз знаходзіцца наш завод, пагражае выкананьню пляну.

Мы стаім перад фактам адсутнасьці на нашым заводзе самога галоўнага хімікату—экстракту, якім вы нас забясьпечваеце.

Вы, таварышы, павінны былі даць нашаму заводу на кастрычнік 56 тон экстракту і на лістапад—60 тон. Далі вы нам у кастрычніку 36 тон, г. зн. не дадалі нам 20 тон. За першую пяцідзённку лістапада мы ад вас не атрымалі ніводнага кілё экстракту.

Невыкананьне вашых абавязацельстваў, таварышы, прыняло наш завод да прастояў. Пачынаючы з 3-й дэкады кастрычніка, з-за адсутнасьці экстракту, мы працуем з перабоямі. Два галоўных цэха нашага завода ўжо 4 дні не працуюць.

Мы зварочваемся да вас, таварышы, з заклікам:

— Пакажэце бальшавіцкія тэмпы работы!

— Змагайцеся за выкананьне і перавыкананьне вашага прамфінпляну, дайце нам патрэбную колькасьць экстракту.

Мы, таварышы, просім вас прыняць усе меры і, перамагаючы перашкоды, у далейшым рэгулярна забясьпечваць нас экстрактамі, без якога наш завод працаваць ня можа.

Уперад, за бальшавіцкія тэмпы ў рабоце!

За датэрміновае выкананьне пляну трэцяга рашаючага году!

З пралетарскім прывітаньнем: па даручэньні рабочых гарбарні —
Дырэктар заводу ЭЗРЫН.
Сакратар калектыву КП(б)Б ШВАРЦМАН.
Старшыня заўкому КЛЮКОЎСКІ.

# Новы парадак крэдытаваньня

## патрабуе выразнай работы гаспадарчых органаў

1 лістапада прайшло. Крэдытаваньне народнай гаспадаркі перайшла на новыя рэйкі. Уведзена новая сыстэма, якая павінна пераварыць крэдыт у сапраўдны сродак узьняцьця гаспадарчага разрахунку на вышэйшую ступень, у сапраўдную зброю штодзённага кантролю рублём.

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу, зусім ясна акрэсьліла значэньне пераходу да повага парадку крэдытаваньня. У гэтым значэньні прычына тэй увагі, якую партыя, урад і ўся грамадзкасьць аддаюць пытаньням крэдыту ў апошні час.

У сувязі з падзяленьнем усіх дзяржаўных гаспадарчых органаў уласнымі зваротнымі сродкамі ў разьмерах, якія забясьпечваюць мінімальныя запасы сырцу, матар'ялаў, тавараў і інш., неабходныя для бесьперабойнай вытворчасьці і тавараавароту, з выстарчальнай канкрэтнасьцю вызначыліся аб'екты банкаўскага крэдытаваньня.

Гэтымі аб'ектамі сталі сэзонныя працэсы ў народнай гаспадарцы (накапленьне па сэзонных прычынах тавараматар'яльных каштоўнасьцяй звыш мінімальных норм, вызначаных пры падзяленьні зваротнымі сродкамі), сумы ў дарозе *) ў выключных выпадках — пазапляновыя патрэбы гаспадарчых органаў, якія выцякаюць з накапленьня тавараў, з-за непадачы вагонаў і г. д.

Замест крэдытаваньня арганізацыі або прадпрыемства «наогул», банк пачынае выдачы пазык на канкрэтныя мэты, вызначаныя пастановай СПА ад 23-VII.

А наколькі крэдыт становіцца мэтавым, наколькі гаспадарчыя органы забясьпечаны мінімальна - неабходнымі ўласнымі сродкамі, крэдыт можа і павінен стаць узваротным.

Пры выдачы кожнай пазыкі банк павінен вызначыць дакладны тэрмін яе пагашэньня, павінен прасачыць за няўхільным выкананьнем гэтага тэрміну, павінен бязьлітасна дастасаваць усе прадугледжаныя ўрадам меры ўзьдзейнасьці ва ўсіх выпадках выплаты пазыкі ў тэрмін.

І вось гэтая бязагаворачная аплата пазык у вызначаны тэрмін плюс выдача пазык у меры фактычнага накапленьня тавара - матар'яльных каштоўнасьцяй, затрат і адгрузак і зьяўляюцца асноўкай фермай кантролю рублём з боку банку.

Той, хто ня выканаў пляну вытворчасьці і рэалізацыі, хто ня выканаў свайго фінансавага пляну і ня можа пагасіць у тэрмін пазыку, атрымае ўдар з боку банку за неаплату пазыкі, які зьявіцца, аб'ектыўна, ударам за невыкананьне фінпляну.

Тое, што банк становіцца адзінай крыніцай, з якой могуць тэрпадца сродкі на сэзонныя патрэбы і кампэнсацыю сум у дарозе, тое, што выдача пазык па гэтым меры пастаўлена ў простую залежнасьць ад выкананьня пляну загатовак, вытворчасьці, рэалізацыі і сваячасовасьці пагашэньня раней атрыманых пазык, патрабуе ад апарату банку і апаратаў гаспадарчых органаў выключна выразнай работы.

Нявыразнасьць, непазаротнівасьць, спробы працягваць ранейшы парадак крэдытаваньня зьявяцца прычынай нявыдачы пазык, што ня змогуць не пацягнуць за сабой значных фінансавых труднасьцяй у рабоце гаспадарчых органаў.

Гэта патрабавала сур'ёзнай і глыбокай падрыхтоўкі да пераходу, патрабуе сёньня хутчэйшага прыстасаваньня работы банку і гаспадарчых органаў да новых умоў.

Але вопыт першых дзён паказвае, што на гэтым фроце далёка ня ўсё добра.

Патрабуем зрабіць першыя вынікі.

### Як падрыхтаваўся банк

Значная работа па падрыхтоўцы сыстэмы Дзяржбанку дала свае станоўчыя вынікі.

Уноч на 1 лістапада адбыўся тэхнічны пераход да новых мэтадаў. Пачынаючы з 1-га лістапада, работа вядзецца па-новаму. Але ёсьць і вузкія месцы. Факты сьведчаць аб тым, што асобныя філіялы Дзяржбанку яшчэ ня здольны працаваць па-новаму. Прыкладам такога аддзяленьня зьяўляецца Асіпавіцкае, дзе недапушчальна адстаюць вучот і справаздачнасьць, дзе не наладжана і крэдытна - плянавая работа, што ня можа не адбівацца на крэдытаваньні. Ёсьць даныя, якія сьведчаць аб тым, што ў Бялынічах ня чытаюць пастаноў Белканторы Дзяржбанку і ў сувязі з гэтым ня ведаюць, як ажыцьцяўляць новыя мэтады крэдытнай працы. У Церахаўскім аддзяленьні ня толькі няма плянавіка, але нават ні на кога пэрсанальна ня ўскладзена адказнасьць за крэдытную работу. Ею займаюцца ўсе і ніхто. Абязьлічка з усімі яе ўласьцівасьцямі і вынікамі. Такіх філіялаў ня многа, але яны ёсьць. І гэта накладае зусім яскравы абавязак на Белкантору Дзяржбанку і раённыя кіруючыя органы ліквідаваць адставаньне ў самы кароткі тэрмін, дабіцца добраякаснай работы адстаючых філіялаў банку.

І тады можна будзе з упэўненасьцю лічыць, што сыстэма банку са сваімі задачамі справіцца.

### Горш у гаспадарчых органах

Ужо ёсьць прыклады, калі гаспадарнікі просяць у філіялаў банку, «як мілясьці» тое, на што яны маюць бязумоўнае права і патрабуюць з зусім ненатрэбнай у гэтых выпадках рашучасьцю таго, на што ня маюць права.

Гэта кажа аб тым, што рад гаспадарнікаў, галоўбухаў да гэтага часу не ўявілі сутнасьці повага парадку крэдытаваньня, не прыстасавалі сваёй працы да новых умоў. І сапраўды, на 1 лістапада, паводле даных 8 філіялаў банку, з 495 арганізацый, якія павінны былі даць свае справаздачныя балянсы, прадаставілі іх толькі 138. Свае дагавары з пакупнікамі прадаставілі 28 проц. арганізацый.

Да гэтага часу ні адно аб'яднаньне Наркамзему і рад іншых аб'яднаньняў ня спусьцілі сваім прадпрыемствам зацьверджаных фінпляну. Рад аб'яднаньняў затрымліваюць разьмеркаваньне зваротных сродкаў па сваёй сетцы.

Ня менш наглядна характарызуе падрыхтаванасьць гаспадарчых органаў і той факт, што па Гомелі толькі 10 проц. гаспадарнікаў на 1-XI ведае суму вызначаных ім зваротных сродкаў, па Віцебску—30 проц., па Бабруйску — 17 проц., а па васьмі па выбары праверанных раёнах — 38 процантаў. Пры гэтым заслугоўвае ўвагі, што нават у Менску, над бокам у аб'яднаньняў, значная частка гаспадарчых органаў ня ведала 1-га лістапада разьмеру вызначаных ім зваротных сродкаў. Так цікавіліся некаторыя гаспадарнікі дырэктывай ЦК і СНК аб новым парадку крэдытаваньня.

Але побач з такімі пасыўнымі гаспадарчымі органамі ёсьць і «актыўныя». Бярэзінскі райспажыўсаюз, напрыклад, праявіў падзвычайную гібкасьць для таго, каб... сарваць ажыцьцяўленьне важнейшай пастановы партыі і ўраду аб гаспадарчым разрахунку.

Каб скаваць свае сродкі ад вачэй банку, ён затрымлівае разрахункі з райзагатканторай і арганізуе справу так, каб атрымаць грошы пасьля першага лістапада, г. зн. пасьля ліквідацыі каптакарэнтаў. Праўда, бярэзінскі райспажыўсаюз не адзіны. Можна прывесьці яшчэ прыклады месьніцкага падыходу, спроб «абыйсьці закон».

Раённым аддзяленьням Дзяржбанку такія факты трэба выкрываць, даводзіць аб іх да ведама грамадзкасьці, перадаваць пракурору для прыцягненьня да адказнасьці і ўжываць рашучыя захады крэдытнай узьдзейнасьці ў адносінах тых, хто з першых дзён зрывае новы парадак крэдытаваньня.

### „У банку няма чаго рабіць"

Другая палова кастрычніка павінна была зьявіцца часам самай напружанай падрыхтоўчай працы ў банку.

30 і 31 кастрычніка былі адказьлейшымі днямі, калі неабходна было правесьці тэхнічны пераход да новых мэтадаў работы. Урад гэтыя дні прызнаў пастолькі важнымі, што дазволіў ня прымаць клієнтуры, ня выконваць ніякіх апэрацый, апрача прыёму грошай. Ня менш адказнымі былі і першыя дні лістапада, калі трэба было пачынаць работу па-новаму.

А тое, што новы парадак крэдытаваньня гэта справа ня толькі банкаўская, здаецца, ясна ўсім. Між тым, гэтага не ўразумелі паасобныя кіруючыя органы раёнаў. Вось прыклады.

У Клічаве ў першыя дні лістапада раённыя арганізацыі накіравалі ў сельсаветы для мабілізацыі сродкаў кіраўніка райбанку, плянавіка і трох супрацоўнікаў бухгальтэрыі. А ўсяго ў Клічаўскім аддзяленьні Дзяржбанку каля 10 працаўнікоў.

Ва Уваравічах на 30 і 31 кастрычніка кіраўніку райбанку было прапанавана разам з усім апаратам выйсьці на ўборку бульбы. Толькі дзякуючы настойлівасьці кіраўніка райбанку, яму ўдалося абмяжавацца пасылкай толькі двух супрацоўнікаў.

Тое, чаго не дарабілі ва Уваравічах, давялі да канца ў Капылі. Там 27-29 кастрычніка аддзяленьне было амаль што закрыта (за выключэньнем касы), бо ўвесь апарат, з рэча касіраў, быў мабілізован на работу па разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасах. А кіраўніка ў гэтым аддзяленьні апошні час зусім няма, бо асоба, якая займае гэту пасаду—увесь час па бульбазагатоўках.

Кожнаму ясна, што бульбазагатоўкі і разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасах важнейшыя кампаніі.

Але ня менш важнай зьяўляецца таксама выкананьне пастановы ЦК і СНК ад 21 кастрычніка і за кошт зрыву гэтага мерапрыемства ня трэба забясьпечваць выкананьне іншых.

### „Выконваюць" фінплян

Усім вядомы пастановы ЦКК УсеКП(б) і іншых органаў аб тым, што раённыя органы не павінны ўмешвацца ў апэрацыйную работу філіялаў банку. Бяз гэтага банк ня будзе органам кантролю рублём.

У Парычах сакратар райвыканкому тав. Карасеўнічым прысылае ў банк запіску з патрабаваньнем аб выдачы грошай адной грамадзянцы, якой кіраўнік банку раней у выдачы адмовіў.

# Жорсткія баі ў Манчжурыі

ШАНХАЙ, 15. Генэрал Ма паведаміў па тэлеграфу ў Нанкін, што ў часе апошніх баёў у раёне ракі Нонні забіта 500 японскіх салдат, 4 японскія самалёты збіты агнём кітайскіх гарматаў. Паводле паведамленьня «Чайна прэс» японскія войскі бяз посьпеху прабуюць прарвацца скрозь левы флянг хэйлунцьзянскіх войск пры дапамозе артылерыйскіх атак. Прыкрываючыся жорсткім артылерыйскім агнём, японскія войскі прабуюць напасьці на Ма і парушыць сродкі яго сувязі. Ма паведаміў па тэлеграфу наступнае: «Падмацаваньні працяглыя прыбываюць штогадзіна. Між тым, хэйлунцьзянскім войскам не аказваецца ніякай дапамогі» (ТАСС).

***

ШАНХАЙ, 14. Карэспандэнт амэрыканскай газэты «Івінг Пост» паведамляе наступнае: «Амэрыканскі консул Хэнсон і іншыя замежныя консулы ў Харбіне пераконаны, што генэрал Ма не атрымлівае дапамогі ад СССР і што толькі цыцыкарскі арсэнал снабжае яго ваенным рыштункам. Як паведамляе адзін з замежных консулаў,—піша далей карэспандэнт,—японскі консул у Цыцыкары таксама адзначае, што генэрал Ма не атрымлівае дапамогі ад савецкага ўраду, хоць японскі консул у Манчжурыі заяўляе, што сібірскія вагоны-цыстэрны з газай патаемна перавозяць ваенны рыштунак.

Консульскі корпус у Харбіне,—паведамляе карэспандэнт,—мяркуе, што ў выпадку акупацыі Цыцыкара, па думцы консульскага корпусу, Харбіну будзе пагражаць нават небясьпека».

## Нямецкі імпэрыялізм падтрымлівае японскіх акупантаў

БЭРЛІН, 14. Атэнцтва Конці папырае наўафіцыяльнае паведамленьне аб германскай назыцыі ў Манчжурскім канфлікце. «У бэрлінскіх палітычных колах,—гаворыцца ў паведамленьні,—лічаць, што ня гледзячы на ўсе сымпатыі да Кітая, ня трэба забываць, што японскія патрабаваньні, бязумоўна, юрыдычна абгрунтаваны. Японія мае права на падставе япона-кітайскага дагавору патрабаваць забесьпячэньня цэлага раду дагаворных правоў у Манчжурыі. Для Японіі Манчжурыя зьяўляецца жыцьцёвым пытаньнем, з прычыны ўкладзеных у яе вялізарных капіталаў, а таксама з прычыны таго, што Манчжурыя можа зьявіцца плацдармам для ўзброваньня ў Карэю. Германія настаяе эпайсьці для падыходзячай сэсіі рады Лігі нацый неабходныя фармулёўкі, якія могуць прывесьці да скончэньня канфлікту» (ТАСС).

## Кітай патрабуе стварэньня нэйтральнай камісіі

БЭРЛІН, 15. Японскі ўрад перадаў генэральнаму сакратару Лігі Нацый новую ноту, у якой выступае супроць таго асьвятленьня, якое дае манчжурскім «інцыдэнтам» кітайскі ўрад. Нота заўважае, што, па думцы японскага ўраду, сакратарыят Лігі Нацый сарыяў увазьнюю ў зман грамадзкай думкі шляхам папярэдняга ня правільных паведамленьняў. Нота яшчэ раз выказвае «прычыны», якія прымусілі Японію ўжыць меры ў сувязі з разбурэньнем маёмасьці на рацэ Нонні. Японская нота рэзка пратэстуе супроць таго, што Японіі «прымісваюць садзейнасьць імкненьням да аддзяленьня Манчжурыі» і паўтарае свае цьверджаньні, што кітайскі ўрад падтрымлівае антыяпонскі рух у Кітаі.

Новая кітайская нота зноў варочаецца да падзей у Цянь-Цьзіне 8 лістапада і ўказвае, што Японія ва ультыматыўнай форме пагражала Кітаю і стварыла тым самым надзвычай небясьпечную атмасфэру. Кітайскі ўрад патрабуе стварэньня нэйтральнай камісіі, у якую павінны ўвайсьці камандуючыя размешчаных у Цянь-Цьзіне гарнізонаў эўрапейскіх дзяржаў для таго, каб гэта камісія не дапусьціла ажыцьцяўленьня японскіх пагроз.

(ТАСС).

## Эвакуацыя Манчжурыі немагчыма—заяўляе японская ваеншчына

ТОКІЁ, 14. Паводле паведамленьня «Хоці» з Кумамота, 13 лістапада на парадзе ваенных улад Сіракава (былы камандуючы Квантунскай арміі, які наведаў Манчжурыю для «вывучэньня стратэгічнага становішча») у сваім дакладзе аб паездцы, між іншым, заявіў, што **эвакуацыя немагчыма.** Нарада прыйшла да выводу, што «тэнэрал Ма абвясьціў вайну Японіі». Было ўказана таксама, што стратэгічныя меркаваньні патрабуюць **заняцьця Ананьцзы і Цьцыкара** з мэтай забясьпечыць японскую армію зімовымі стаянкамі. (ТАСС).

## Пагроза захвату японцамі Цянь-Цьзіня

ШАНХАЙ, 15. У кітайскіх палітычных колах выказваюць здавальненьне тым, што Нанкін адхіліў патрабаваньне Японіі аб выводзе кітайскіх войск з Цянь-Цьзіня. Чакаюць, што цяпер Японія ўжывае «неабходныя меры для абароны інтарэсаў Японіі ў Цянь-Цьзіне», як гаворыцца ў ноце Сігемітцу. У некаторых колах мяркуюць, што ёсьць магчымасьць акупацыі Цянь-Цьзіня або рашучых дзеянняў Японіі на рацэ Яцзы.

# „КАМПАРТЫЯ РУКА АБ РУКУ З УНІТАРНЫМІ ПРАФСАЮЗАМІ ПАВЯДЗЕ РАБОЧУЮ КЛЯСУ ДА ПЕРАМОГІ

## Закрыцьцё зьезду рэвалюцыйных прафсаюзаў Францыі

ПАРЫЖ, 14. На зьезьдзе унітарных прафсаюзаў па скончэньні спрэчак па пытаньні аб прафадзінстве выступіў з заключным словам тав. Жытон.

У сваім выступленьні тав. Жытон супроцьпаставіў два зьезды—рэфармісцкай канфэдэрацыі працы і унітарнай канфэдэрацыі працы. «Рэфармісты,—заявіў тав. Жытон,—адмовіліся дапусьціць на свой зьезд дэлегацыю унітарных прафсаюзаў у той час, як на зьезьдзе унітарных прафсаюзаў дэлегаты ўсіх напрамкаў мелі магчымасьць свабодна выказваць свае думкі. Работы абодвух зьездаў прадэманстравалі розьніцу паміж буржуазнай дэмакратыяй і дэмакратыяй пралетарскай. Тав. Жытон падкрэсьліў, што ня можа быць і гутаркі аб уваходзе ў рэфармісцкую канфэдэрацыю працы, ня гледзячы на неабходнасьць падтрыманьня апазыцыі ў рэфармісцкіх прафсаюзах і неабходнасьць адзінага фронту барацьбы шляхам стварэньня пізавых камітэтаў барацьбы».

Сьледам за выступленьнем тав. Жытона з прывітаньнем ад імя французкай кампартыі выступіў тав. Кашэн. Тав. Кашэн падкрэсьліў абавязак пралетарскай салідарнасьці французскага пралетарыяту ў адносінах да пралетарыяту Германіі. Далей тав. Кашэн паказаў на ролю кампартыі ў абароне СССР супроць капіталістычнага сьвету.

Пераходзячы далей да пытаньня аб кіруючай ролі кампартыі ў рабоце прафсаюзаў, тав. Кашэн асудзіў «старую французкую песеньку» аб незалежнасьці прафсаюзаў, падкрэсьліў непарыўнасьць палітыкі і прафруху. «Барацьба за лепшыя ўмовы працы,—заявіў тав. Кашэн,—павінна быць увязана з барацьбой за захват улады, за вызваленьне пралетарыяту. Сумесная барацьба паміж рэвалюцыйнымі прафсаюзамі і адзінай рэвалюцыйнай партыяй—намінуча». Тав. Кашэн падкрэсьліў неабходнасьць выключыць усякую магчымасьць аб'яднаньня з рэфармісцкімі правадырамі.

Сваю прамову тав. Кашэн заканчвае словамі: «Кампартыя рука аб руку з унітарнымі прафсаюзамі павядзе рабочую клясу да перамогі». Зьезд наладжвае тав. Кашэну бурную авацыю. Дэлегаты пяюць «Інтэрнацыянал». Пасяджэньне зьезду закончылася бурнымі воплескамі і зборамі ў карысьць «Юманітэ».

## Выкрыцьцё фашысцкай арганізацыі ў Швэцыі

СТАКГОЛЬМ, 13. Увесь шведзкі друк працягвае публікаваць выкрыцьцё выяўленай нядаўна тайнай фашысцкай арганізацыі ў Швэцыі. Апублікаваны матар'ялы, якія пацьвярджаюць ужо вядомы факт, што фашысты мелі дэтальна распрацаваны плян вулічнай барацьбы, барыкадных боек з рабочымі і раскідваньня лістовак пры дапамозе самалётаў. Пляны прадугледжваю таксама арышт рэвалюцыйных лідэраў, узбраеньне буржуазіі і контр-рэвалюцыйныя выступленьні на выкадак паўстаньня ка муністаў». Многія газэты адкрыта пішуць аб сувязі былога ўраду Эксмана з фашыстамі. «Сацыял-дэмакратэн» апублікаваў сьпіс асоб—ваенных і чыноўнікаў, замешаных у фашысцкім руху. Былы паліцмэйстэр Стакгольму Харлеман прызнаў на судзе, што ён ведаў аб існаваньні тайнай фашысцкай арганізацыі і разглядаў яе, як «добраахвотны рэзэрв для паліцэйскай службы». (ТАСС).

## Мільён беспрацоўных у Францыі

ПАРЫЖ, 14. Французкі друк паведамляе падрабязнасьці ўчарайшых спрэчак у палаце дэпутатаў па пытаньні аб беспрацоўі. У спрэчках перавышалі выступленьні супроць замежных рабочых. Дэпутат Тэтынгер (саюз рэспубліканскіх дэмакратаў), арганізатар фашысцкай міліцыі Таст (група Тардзье), вымушаныя прызнаць, што лік поўных беспрацоўных ва Францыі дасягае 1 млн., паказвае на неабходнасьць масавага выгнаньня з Францыі замежных рабочых, якія «ня маюць рабочых картачак ці рэгулярных дакумантаў».

## Скарачэньне прадукцыі чыгуну і сталі

ПАРЫЖ, 9. Паводле статыстычных вестак за 9 месяцаў бягучага году выпуск чыгуну ва Францыі раўняўся 6 млн. 469 тыс. тон супроць 7.690.000 тон за адпаведны пэрыяд мінулага году. Выпуск сталі за тойжа пэрыяд часу скараціўся з 7.144.000 тон да 6.108.000 тон.

# ПА СССР І БССР

## Перад пускам Саркамбайну

МАСКВА. Нарада пры Саюзсельмашы прызнала, што становішча будаўнічых работ на мантажы і абсталяваньні Саркамбайну можна лічыць гатовым да пуску на працягу бягучага кварталу. Таму пастаноўлена прасіць прэзыдыум ВСНГ СССР вылучыць пры ёмачную камісію. Нарада прыняла да ведама абавязацельствы рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу заводу даць ужо ў бягучым годзе 200 камбайнаў, а да ўборачнай кампаніі будучага году—4.000. Гэта задача магчыма да выкананьня, аднак, толькі пры ўмове пасьпяховага камбінаваньня работы Саркамбайну з радам іншых заводаў. Нарада намецілa ў сувязі з гэтым рад канкрэтных мер па ўвязцы работы Саркамбайну з Любарэцкім заводам сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, Растоўскім сельмашам, Запароскім «Камунарам», Саратаўскім заводам імя Леніна, «Красным металлистом» у Ленінградзе і іншымі па частцы снабжэньня пакоўкамі, дэталямі, коламі, чыгуном і інш. З прычыны падыходзячага пуску заводу праведзена разьмежаваньне функцый паміж кіраўніком будаўніцтвам і заводакіраўніцтвам. На кіраўніка заводам тав. Вятчынкіна ўскладаецца кіраўніцтва падрыхтоўкай заводу да пуску і арганізацыяй вытворчасьці, выкананьнем праграмы спабжэньня і г. д.

## Габудсеа вялікага рыбна-кансэрвовага заводу

МАСКВА, 13-га лістапада. Выкопваючы пастанову ЦК партыі, кансэрвовая кантора Саюзрыбы пачынае пабудаваць на Волзе ў Касьцінскім раёне ў 1932 г. рыбна-кансэрвовы завод прадукцыйнасьцю ў 10 млн. банак у год, коштам у 800 тыс. руб. Апрача таго будуць закончаны будаўніцтвам 5 плывучых ледаў-заводаў магутнасьцю ў 15 млн. банак кансэрваў у год коштам у 1.500 тыс. руб.

## Каштоўнае вынаходзтва ў шкляной прамысловасьці

Навукова-дасьледчы інстытут прамысловасьці пры ВСНГ БССР закончыў лябараторную работу па скарыстаньні вазёрнай гліны ў шкляной прамысловасьці. Досьледы далі добрыя вынікі.

Скарыстаньне новага віду сырцу адкрывае вялікія пэрспэктывы для разьвіцьця шкляной прамысловасьці ў БССР, значна зьніжіць кошт шкла і дасьць магчымасьць з'эканоміць сотні тысяч рублёў залатой валюты.

## На разьвіцьцё камунальнай гаспадаркі г. Менску

На 1932 год адпушчана на пабудову Менскай цэплаэлектрацэнтралі 8.830.500 рублёў, на каналізацыю—2.020 тыс. рублёў, на пашырэньне трамвайнага руху ў Менску—2.200 тыс рублёў.

На пашырэньне аўтатранспарту ў Менску асыгнавана 1.280 тыс. рублёў, гужтранспарту—401.200 рублёў, на пабудову новых цагелень—961 тыс. рублёў.

## Фабрыку „Сьцяг індустрыялізацыі“—на буксірі

ВІЦЕБСК, 15-XI. (БелТА). Швэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» выканала прамфінплян 3-га кварталу толькі па 66 проц. Рэдакцыя газэты «Дэр Эмэс», па дагаворанасьці з ЦК саюзу швэйнікаў, пасылае на фабрыку буксірную брыгаду. Накіроўваюцца па фабрыку таксама буксірныя брыгады газэты «Віцебскі пралетары», ЦП саюзу швэйнікаў і рабочых фабрыкі «Прафінтэрн».

# Якасьць валакна—важнейшае зьвяно ў барацьбе за лён

У сваёй апошняй пастанове аб ходзе першапачатковай апрацоўкі і здачы прадукцыі тэхкультур, ЦК КП(б)Б выразна ўказаў на неабходнасьць **«практыкаваць заключэньне сацдагавораў паміж фабрыкамі і заводамі, якія апрацоўваюць лён і канопліі, з раёнамі, пасобнымі калгасамі і саўгасамі, прадугледзіўшы пры гэтым аказаньне дапамогі калгасам і саўгасам з боку прамысловасьці, шляхам інструктаваньня аб мэтадах лепшай першапачатковай апрацоўкі ільну, пасылкі рабочых брыгад і г. д.».**

Пасобныя раёны яшчэ не пераключыліся на выкананьне гэтых указаньняў ЦК КП(б)Б. Пераапрацоўка ільну разгортваецца марудна, што ставіць пад нагрозу своячасовае выкананьне плянаў загатовак. **Недапушчальна вялика рад раёнаў** ўключаюцца ў месячнік апрацоўкі і загатоўкі тэхкультур, абвешчаны ЦК КП(б)Б.

Нават там, дзе больш-менш разгорнута пераапрацоўка ільну, **загатоўкі тармозяцца з прычыны адставаньня трапаньня ільну.** Вельмі кульгае апрацыйнае кіраўніцтва раённых і загатоўчых арганізацый. У выніку дрэнай апрацоўкі, **прадукцыя ільну зусім нізкай якасьці.**

Усё гэта можа быць ярка праілюстравана на практыцы Сіроцінскага раёну.

У Казянскім сельсавеце трэба апрацаваць ураджай ільну з 440 гэктараў ільна-траста са сьцелішч узьнята ўсі, зьвезена і захавана пад навесі. Падрыхтавана 14 ільнаапрацоўчых пунктаў, якія забясьпечаны сушылкамі і апаламі.

У калгасах складзены спэцыяльныя брыгады па сушцы і мяцьці ільну. Гэтыя брыгады па ніякую іншую работу не пасылаюцца. У больш буйных калгасах, напрыклад, **«Чырвоны партызан»** складзены 4 брыгады, **«Ленінскі прамень»** — 3 брыгады, **імя Чарвякова, «Чырвоны кастрычнік», імя Энгельса** — па 2 брыгады. У астатніх ў сельсавеце 17 калгасаў.

Пераапрацоўка ільну ў большых калгасах, дзе ёсьць па 2, 3, 4 брыгады, праходзіць **у 2 зьмены.** Першая брыгада з вечару пасаджвае трасты ў сушню. За ноч траста высыхае. Раніцай гэта самая брыгада пачынае мяцьцё, якое канчаецца вечарам. У той час, калі першая брыгада мне лён, другая брыгада (другая зьмена) лён сушыць у другой ёўні і пачынае мяць вечарам, а канчае ў 10-11 гадз. ночы. Такім чынам **дасягаецца максымальная нагрузка мялак** пры скарыстаньні розных сушань.

Трэба адзначыць, што сушыльшчыкі не складаюць асобнай брыгады, а ўваходзяць у брыгаду мяльшчыкаў, якая падзяляецца на: сушыльшчыкаў, падавальшчыкаў у машыну, падавальшчыкаў трасты да мялкі, падносчыкаў трасты да сушні, абтрасальшчыкаў і паганяльшчыкаў коняй. Брыгада па мяцьці і сушцы (пры рабоце на 3-хвальнай мялцы) складаецца з 6-7 чалавек. У залежнасьці ад таго, як чыста абтрасаецца лён ад трасты, у брыгаду ўваходзіць 1-2 абтрасальшчыкі.

Такая арганізацыя сушкі і мяцьця бязумоўна мэтазгодна. Уся брыгада, на чале з брыгадзірам, поўнасьцю адказвае за сушку і мяцьцё. Атрымаўшы заданьне апрацаваць пэўную колькасьць трасты, брыгада даводзіць гэту справу да канца.

У Казянскім сельсавеце ўжо **намята 16 тон валакна, злана-ж толькі 2 тоны.** Чаму такі разрыў?

Справа ў тым, што **няма ўвагі да арганізацыі брыгад трапцоў.**

Пытаньне з трапаньнем ільну — адно з вастрэйшых пытаньняў ня толькі ў Казянскім сельсавеце. У Казянскім і радзе іншых сельсаветаў **лён пры трапаньні абсякаецца,** бо ўжываецца спосаб простага абіваньня маленькіх жменяк ільну маленькімі трапачкамі. Ад хуткіх ударaў такіх маленькіх трапачак па маленькай жменьцы ільну лён сячэцца, падае ў кастру. **У панлю адыходзіць ад 25 да 50 проц. валакна.** У выніку гэтага бываюць выпадкі, калі лён, які на полі быў добрай якасьці, здаецца па загатоўчы пункт зусім **нізкіх нумароў.**

Пры правільным-жа трапаньні неабходна мець падстаўку, на якую кладзецца буйная жменя ільну. Трапачка ўжываецца вялікая, якая, падаючы плаўна, лён сапраўды трэпле, чэша, а не абівае.

**Вобальскі** ільнаапрацоўчы пункт па будован у 1930 годзе. На будаўніцтва затрачана 14.000 руб. Устаноўле па адна шэсьціпарвальная мялка і пяць бэльгійскіх трапальных колаў. Гэты пункт у цяперашні момант — **бяспрытульны.**

Сыстэма **Белільнасаюзу** павінна была перадаць гэтыя пункты (па Беларусі іх налічваецца дзесяткі) сыстэме **Калгасцэнтру.** Аднак і дагэтуль **не перадала.** Райкалгасасаюзы адмаўляюцца прыняць гэтыя пункты. Паколькі пункты абязьлічаны (няма гаспадара), праца праходзіць зусім дрэнна. Вобальскім пунктам спачатку карыстаўся калгас «Чырвоны штандар». Ён зьмяў толькі 9 тон трасты за 7 дзён. Зараз, лён мне калгас «Перамога» таксама **па 1,5 тоны ў дзень.**

Старшыні калгасаў такую малую нагрузку ільнаапрацоўчых пунктаў тлумачаць тым, што за адзін раз сушня можа высушыць 1,5 тоны трасты. Для мяцьця гэтай трасты на 12-цівальнай мялцы патрэбна 4 гадзіны, значыць, **мялка стаіць без работы 20 гадзін у суткі.** Гэта ў той час, калі ў бліжэйшых калгасах простых ёўняў ёсьць даволі. На іх можна папярэдня сушыць лён і прывозіць на пункт для мяцьця. Такім чынам можна забясьпечыць работу пункту на працягу **круглых сутак** і зьмяць на менш чым **10 тон у суткі.**

Трапаньне ільну на Вобальскім ільнаапрацоўчым пункце ідзе сьледам за мяцьцём. Трэпле лён спэцыяльная брыгада, аднак, якасьць трапаньня надзвычай дрэнная, такая, як і ў Казянскім сельсавеце. З трапаньня лён выходзіць **кароткі, абсечаны.**

Характэрна падкрэсьліць, што тутжа пры ільнаапрацоўчым пункце ў 10 кроках знаходзіцца загатоўчы пункт. Зарплата загатоўшчыка стабільная—100 руб. у месяц. **Дырэктыва партыі аб пераводзе загатоўшчыкаў на аплату ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі, не ажыцьцяўляецца.** Зьдзельна-прэміяльная сыстэма ня ўведзена.

У **Амбросаўскім** сельсавеце засеяна 469 гэкт. ільну. З усёй гэтай колькасьці не абмалочана і не разасланэ 26 гэкт. у калгасах **«Шлях Леніна»** і **імя 1-га мая.** На Амбросаўскім сельсавеце для пераапрацоўкі ільну створаны 4 кусты, у якія ўваходзіць па 3-4 калгасы (усяго ў сельсавеце 14 калгасаў). На двух пунктах устаноўлены дзьве шэсьціпарвальныя мялкі, на астатніх — дробныя мялкі. Усе гэтыя пункты акружаны патрэбнай колькасьцю сушань.

Для работы на пунктах складзены зьмешаныя брыгады з калгасьнікаў тых калгасаў, якія ўваходзяць у куст. Сельсавет мяркуе, што такія брыгады будуць на парадку мяць лён аднаго, другога, трэцяга калгасу і што, такім чынам, будзе дасягнута канцэнтрацыя сіл і арганізаваны яясупынны канвэер пераапрацоўкі ільну. Арганізацыя такіх кустоў яшчэ выклікана і недахватам мялак.

Аднак, сельсавет.... **толькі мяркуе.** Брыгады складзены **на паперы.** Кусты яшчэ не працуюць і сказаць, што дае арганізацыя зьмешаных брыгад, нельга. Лён пакуль што ў пасобных калгасах пераапрацоўваецца на простых мялках і рукамі. Да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі не загатоўлена **ні ад наго кілёграму ільну.**

Па ініцыятыве бюро РК у раёне была складзена раённая «сквозная» брыгада. У яе ўваходзіла па 1-2 вопытных калгасьнікі (сушыльшчыкі, мяльшчыкі, трапальшчыкі) з больш буйных калгасаў. Брыгадай кіраваў агранам.

Перад брыгадай ставіліся задачы: **перанесьці лепшы вопыт пераапрацоўкі ільну ва ўсе калгасы Сіроцінскіх.** Мэта сур'ёзная. Мерапрыемства райкому КП(б)Б заслугоўвае вялікай увагі. Аднак, «сквозная» брыгада... **развалілася.** Віноўнікам развалу зьяўляецца старшыня райкалгасасаюзу, заядлы апартуніст, зьняты з работы.

Факты гаворацьь, што тэмпы пераапрацоўкі прадукцыі тэхкультур можна **ўдзесяцярыць.** Патрэбна толькі, каб раённыя арганізацыі забясьпечылі гэту важнейшую работу апэрацыйным кіраўніцтвам. Усямерна разгортваючы мяцьцё прадукцыі тэхкультур, неабходна з усёй сур'ёзнасьцю вырашыць пытаньне аб трапаньні ільну, г. зн. **аб якасьці прадукцыі.**

Прыклад Казянскага сельсавету і Вобальскага ільнаапрацоўчага пункту—не адзіны. На Вобальскі загатоўчы пункт, напрыклад, прывозілі лён для здачы дзесяткі калгасаў і аднаасобныя гаспадарак, але ў большасьці лён ня прымаўся, бо **ня вытрымлівае кандыцыі.**

Барацьба за якасьць валакна не разгорнута. Загатоўчы апарат **фармальна** адносіцца да сваіх абавязкаў і ў ролі загатоўшчыкаў выступае толькі як брокер, а не як арганізатар барацьбы за якасьць. Загатоўшчыкі атрымліваюць зарплату не ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі. Яны матар'яльна не зацікаўлены ў барацьбе за паскарэньне загатовак, за якасьць прадукцыі.

Якія-ж арганізацыйныя мерапрыемствы трэба прыняць для паляпшэньня якасьці прадукцыі тэхкультур? Ці мае раён матчымасьці для вырашэньня гэтай важнейшай задачы?

Справа ў тым, што ў мінулыя гады, як па Сіроцінскім, так і па некаторых іншых раёнах лён здаваўся на загатоўчыя пункты сырцом. Калгасьнікі і аднаасобныя гаспадаркі ў большасьці трапаньнем ільну не займаліся, а кулак здаваў проста фальсыфікаваны лён. Трапаньне ільну спэцыялістамі-трапцамі арганізоўвалася пры загатоўчых пунктах.

Дзяржава сёлета павінна атрымаць толькі трапаны лён высокай якасьці. Гэтага можна дасягнуць, калі правільна скарыстаць тых спэцыялістаў, якія ёсьць. Канкрэтна папрашваецца наступнае мерапрыемства. **Трэба заразжа вызьліць вопытных трапцоў і склясьці з іх інструктарскія брыгады. На гэтыя брыгады і трэба ўскласьці кіраўніцтва работай маладых трапцоў у калгасах, падрыхтоўку патрэбных кадраў.**

Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны забясьпечыць хутчэйшае ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства, стаць на чале барацьбы за якасьць ільну. **Якасьць прадукцыі тэхкультур павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі, як важнейшае зьвяно ў ланцугу мерапрыемстваў па арганізацыйна-гас падарчым умацаваньні ільнаводных калгасаў.**

Сіроцінская партарганізацыя выпала перамождай з другой бальшавіцкай вясны. Яна павінна перамагчы і на адказьнейшым вучастку пераапрацоўкі і загатовак прадукцыі тэхкультур.

**А. Мікуцкі.**

## Паведамленьні

— **Дом Камасьветы.** 16-XI — індывідуальная кансультацыя па гісторыі клясавай барацьбы.

— **Менгаркам КП(б)Б склікае** 16 лістапада г. г., у 2 гадз. дня, у памяшк. Гаркому (3-ці паверх) нараду сакратароў вытворчых партколектываў і ячэек КП(б)Б. У сувязі з важнасьцю пытаньняў, яўка абавязкова і без спазьненьня.

— **Культпроп ЦК** паведамляе, што 17-XI г. г. у 1 гадз. дня (пакой № 12) адбудзецца пасяджэньне брыгады па падрыхтоўцы тэзісаў да партнарады па мастацтве па дакладу «Трамы і самадзейнае мастацтва», у складзе т. т. Клімковіча (ЦСПСВ), Іванова (Ведтрам), дыректара яўрэйскага траму, Шамшура і Гурецкага. Яўка абавязкова.

— **Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б** просіць зьявіцца ў ЦК, пакой № 33, т. Бразінскага Уладзімера Сяргеева па яго справе.

— **Партколегія ЦКК КП(б)Б** паведамляе, што **20-XI—31 г. у Буда-Кашалёве** будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынством т. Біге на разгляду апэляцыйных спраў наступных т. т.: Грапчэня М. Д., Якаўлева Я. Я. (Буда-Кашал. раён), Новікава М. Д., Карнеева М. Я., Кавалёва І. К., Болсуна І. Г., Сталярчука П. Я., Бураковa П. Я., Кузьменкова С. П. (Чачэрскі раён), Малашэнкі С. Я. (Уваравіцкі раён). **22-XI—31 г.** будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам т. Іванова **ў г. Гомелі** па разгляду апэляцыйных спраў наступных т. т.: Табухова Р. М. (Гомельскі раён), Адшколава І. А. (Гомель), Скржынскага В. Ю., Астроўскага М. Г., Хільковіча С. Я., Сарокіна А. П., Марголіна Б., Чмырова М. К., Ігольнікава В. Н., Вэрысоўскага М. Ф., Бусеенка Е. І. (Гомельскі раён), Бурага К. В. (Добруш), Сазонава К. Г., Портэра Г. Я (Нова-Беліца), Рэмізавай Н. М., Усхопава П. Д. (Веткаўскі раён), Міхальчэнка І. З. (Церахаўскі раён). **23 і 24-XI—31 г.** будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынством т. Біге **ў г. Мазыры** па разгляду апэляцыйных спраў наступных т. т.: **23-XI** — Лук'янцава Д. Ф., Кісялева Р. В., Говара Н. Е., Гарбаткоўскага А. Р., Шашолка А. П., Дзекаленка В. Ф., Сталярчука І. Я., Гомана Л. К., Новікава М. К. (Мазырскі раён); **24-XI** — Шустэрмана Л. А. (Нараўлянскі раён), Рэкіна (Мазырскі раён), Тарасіка М. К. (Ельскі раён). **26-XI** будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынством т. Біге **ў м. Жыткавічы** па разгляду апэляцыйных спраў наступных т. т.: Строгапава, Жукава К. С., Сацэвіча М. М. (Жыткавіцк. арг.), Гаўрыленка С. В., Худалёва М., Гінзбурга Р. Х., Арыповіча А. А., Разуцкага І. С., Казловіча І. А., Давідзюка І. К. (Петрыкаўскай арг.). Яўка ўсіх памянёных т. т. на пасяджэньне ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова.

— 17-XI і 18-XI, у 10 гадз. раніцы, у Бюро Скаргаў ЦКК НК-РСІ адбудзецца збор «ЛК» і рабочых засядацеляў, удзельнікаў у праверцы крам. Вылучаныя т. т. і выходныя павінны зьявіцца без спазьненьня.

— 18-XI, у 6 гадз. увечары, у памяшканні Бюро Скаргаў ЦКК НК-РСІ БССР адбудзецца пасяджэньне гарадзкога штабу «ЛК» г. Менску. На пасяджэньне павінны зьявіцца наступныя т. т.: Кучараў — ЦКК-РСІ, Мітэльман — ЦКК-РСІ, Кузьнец — Саюзтранс, Амбражэвіч — завод імя Варашылава, Русак — чыгунка, Чэрняк — ф-ка «Кастрычнік», Сідляр — друкарня імя Сталіна, Ільчук — «Бальшэвік», Лапатухін — завод імя Варашылава, Рыбакоў — Саўбуд, Кузьміч — Будтэхнікум. Вышэйпазначаных т. т. яўка абавязкова пад адказнасьць сакратароў гамсамольск. калектываў.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.


З прычыны пераходу рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА“ на пяціднеўку—перапынку, газэта ня будзе выходзіць 2, 7, 12, 17, 22, 27 кожнага месяца.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ І ДЗЯРЖКРЭДЫТУ БССР ДАВОДЗІЦЬ ДА АГУЛЬНАГА ВЕДАМА, ШТО

4 ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ПАЗЫЦЫ „ПЯЦІГОДКА за ЧАТЫРЫ ГАДЫ“ І III-й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

АДБУДЗЕЦЦА 25—28 лістапада 1931 году ў гор. Нова-Сіберску.

У тыражы прымаюць удзел усе аблігацыі пазыкі „Пяцігода за чатыры гады“ і 3-й пазыкі індустрыялізацыі, за выключэньнем раней ужо выйграўшых.

У гэтым тыражы будзе разыграна:

| Па процантна-выйгрышным выпуску: | | Па беспроцантна-выйгрышным выпуску: | |
|---|---|---|---|
| 19 выйгрышаў па | 5.000 руб. | 68 выйгрышаў па | 5.000 руб. |
| 383 „ „ | 1.000 „ | 680 „ „ | 1.000 „ |
| 46.531 „ „ | 200 „ | 196.792 „ „ | 200 „ |

Я ўсяго па абодвых выпусках 244,470 выйгрышаў на агульную суму 50.150.800 р.

Па кожным выпуску як процантна-выйгрышным, так і беспроцантна-выйгрышным тыраж праводзіцца самастойна.

Афіцыяльная табліца выйгрышаў будзе надрукавана ў газэце „Известия ЦИК СССР и ВЦИК“.

Усе пазыкатрымальцы, якія яшчэ не абмянялі свае аблігацыі 1 і 2 пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі, павінны пасьпяшаць абмяняць гэтыя аблігацыі на пазыку „Пяцігода за 4 гады“ да 25-га лістапада 1931 г., з тым, каб удзельнічаць у тыражы выйгрышаў.

Адначасова, даводзіцца да ведама адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстаноў аб неабходнасьці неадкладна атрымаць у крэдытных установах аблігацыі 1-га выпуску „Пяцігода за 4 гады“ і раздаць іх да тыражу на руці падпісчыкам.

Начальнік Кіраўніцтва Ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР ЗАХАРАВА.
Інспэктар па Дзяржкрэдыту ЛЬВОЎ.

Чырв. Зорка Пач. 6, 8-20.10-30 — Гаварашчы гукавы фільм ЗЛАТЫЯ ГОРЫ

„КУЛЬТУРА“ Пач. 7, 8-45, 10-30 — 1) Вялікая бяда Невялікай жанчыны 2) Электрязавод культурфільм

„Інтэрнацыянал“ — Замежны фільм Наканьне і спорт. Звыш праграмы: Бурсвесьнік 3-х рэвалюцый

ПРАЛЕТАРЫ — Бэстэр Кітон АПАНТАНЫ у 6 ч. Звыш праграмы БАЛХАШ у 2 ч.

„Юны Піянэр“ (Сурыкаў кіно „Культура“) — Арыгінальная камэдыя „Два друга, модельн подруга“ Звыш праграмы—хроніка Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. ран.

„СПАРТАК“ Увесь сэрэрыт з 5 г. — Вэндэтны фільм ЧАЛАВЕК З ЛЕСУ Драма ў 7 частках

МЕНГАРСТРАХКАСА

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА

ўсіх прафэсіянальных і грамадзкіх арганізацый, што

ў Доме Адпачынку імя 11-га ліпеня у Жданові чкі ЁСЬЦЬ платныя месцы.

Жадаючыя ўпісацца на месцы павінны заключыць умову са Страхкасай (Чырвонаармейская 16) да 20 лістапада г. г.

Кошт месца на 14 дзён 60 руб.

Менгарстрахкаса.

СЁНЬНЯ, 16 лістапада, у 8 гадз. веч., у Доме Пісьменьніка АДБУДЗЕЦЦА сумеснае пасяджэньне крытычнай сэкцыі БелАПП'у і Інстытуту літаратуры БАН. ДАКЛАД т. АРУЦЮНЯНЦА „Ленін і Пляханаў, як дыялектыкі“ Запрашаюцца пісьменьнікі, асьпіранты, студэнты, настаўнікі.

17-га лістапада у 7 гадз. вечара адбудзецца агульны партыйны СХОД калектыву КП(б)Б Будаўнічага інстытуту ў памяшканьні залі Хэм.-Тэхнал. Інстытуту (Замляробскі заў., 4). Яўка ўсіх партыйцаў, у тым ліку і практыкантаў, якія знаходзяцца у гор. Менску,—абавязкова.

Бюро калектыву.

Сёньня, 16 лістапада, у 6 гадз. веч., у падгабінэце (Дом Асьветы, Камуністычн., 19) — адбудзецца — сход т-ва пэдагогаў-марксыстаў. Парадак дня: 1) Аб кампаніі насьці і школе 1-й ступені. 2) Выбары праўленьня т-ва. Яўка ўсіх членаў т-ва абавязкова. Запрашаюцца настаўнікі школ г. Менску, члены т-ва дзяцінскіх настаўнікаў-матэрыялістаў.

Згодна пастановы СНК ад 18-IV—31 году, пры Наркамгасе БССР арганізавана Беларускае Камунальна-Будаўнічае Аб'яднаньне „БЕЛКАМУНБУД“, якое будзе вытвараць камунальна-жыльлёвае і непрамыслов